Наукова Бібліотека
ім. Короленка. Харків

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 90 (6066) | 20 красавіка 1938 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Узмоцнім і ўмацуем інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам капіталістычных краін! Вышэй сцяг міжнароднай пролетарскай салідарнасці!

(З ПЕРШАМАЙСКІХ ЛОЗУНГАЎ ЦК ВКП(б)).

ЛОЗУНГІ БАРАЦЬБЫ І ПЕРАМОГ

Праз дзесяць дзён наша вялікая неабсяжная краіна, усё працоўнае чалавецтва будуць святкаваць дзень 1 мая — дзень міжнароднай пролетарскай салідарнасці. Сёння мы публікуем лозунгі Сталінскага Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), прысвечаныя вялікаму святу — 1 мая — баявому агляду рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята.

Гэты вялікі дзень мільёны працоўных усіх краін будуць святкаваць пад непераможным чырвоным сцягам, на якім вогненымі літарамі напісана:

«Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся! Станавіцеся пад інтэрнацыянальны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна!».

У абстаноўцы выключнага абвастрэння міжнародных супярэчнасцей сустракаюць 1 мая працоўныя ўсіх краін. Барацьба паміж старым капіталістычным светам, светам гвалту, войн, эксплуатацыі і жабрацтва і перадавым, прагрэсіўным чалавецтвам уступіла ў новую фазу—фазу найглыбейшых канфліктаў, пагражаючых страшэнным узрывам. Імперыялістычная буржуазія шукае выхаду з крызіса на шляхах крывавай тэрарыстычнай дыктатуры супроць рабочых і сялян, на шляхах фашызма, шукае выхаду ў захватніцкіх, разбойніцкіх войнах. Фашызм узбройваецца шалёнымі, ліхаманкавымі тэмпамі за кошт асуджэння працоўных на голад і жабрацтва.

Полчышчы італа-германскіх інтэрвентаў заліваюць кроўю свабодную Іспанію, сеюць смерць і руйнуванне, імкнучыся падняволіць, закабаліць гераічны іспанскі народ. Японская ваеншчына ўварвалася ў Кітай, з варварскай лютасцю забівае безабаронных жанчын і дзяцей, ператварае ў руіны квітнеючыя гарады і сёлы. Карыстаючыся патуранням так называемых дэмакратычных краін, германскі фашызм уварваўся ў Аўстрыю і на працягу аднаго дня спыніў яе незалежнае існаванне.

Крывавыя дралежнікі працягваюць свае лапы да дэмакратычнай Чэхаславакіі, пагражаюць яе незалежнасці.

Фашысцкія мракабесы на вачах усяго цывілізаванага свету ўстанавілі ў пакаронай імі Аўстрыі рэжым гвалту і жупаснага тэрору.

Падпальшчыкі вайны рыхтуюць новую сусветную бойню, рыхтуюць напад на СССР — адзіную на земным шары краіну социялізма. Як ніколі гарызонт пакрыт навальнічнымі хмарамі — прадвеснікамі вайны.

Працоўныя Германіі, Японіі, Італіі, Іспаніі, Аўстрыі, Кітая на горкім вопыце адчулі, што такое фашызм.

«Фашызм — гэта тэрарыстычная палітыка капіталістаў і памешчыкаў супроць рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі. Фашызм — гэта захватніцкая вайна. Фашызм — злейшы вораг дружбы паміж народамі свету. Мабілізуем сілы на барацьбу з фашызмам!»

Пад гэтым баявым лозунгам згуртоўваюцца працоўныя ўсяго свету, усё перадавое чалавецтва, шырыцца і мацнее народны фронт барацьбы супроць фашызма і вайны. Усе тыя, хто дарожыць дэмакратычнымі свабодамі, хто ненавідзіць гвалт і фашысцкі тэрор, у каго ў грудзях б'ецца чэснае сэрца, каму блізкі інтарэсы міру, — яднаюцца пад сцягамі народнага фронта.

Як-бы ні старалася контрэволюцыйная буржуазія і яе верныя слугі — поллыя трацкісты—задушыць рэволюцыйны рух мас, як-бы ні стараліся яны сштурхнуць народныя масы са шляху барацьбы супроць фашызма і вайны, ідэі народнага фронта заваёўваюць усё новыя і новыя мільёны людзей. Ідэя штурму зрэе ў сазнанні мас, ніякім тэрорам, ніякімі гвалтамі не знішчыць яе!

«Барацьба іспанскага народа супроць унутранага і замежнага фашызма — агульная справа ўсяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва. Прывітанне гераічнаму іспанскаму народу, які змагаецца за сваю незалежнасць і свабоду!»

Вялікі кітайскі народ, згуртаваны ў радах нацыянальнага антыяпонскага фронта, ініцыятарам якога з'яўляецца комуністычная партыя Кітая, дае магутны адпор японскім захватчыкам, заваёўвае бліскучыя перамогі над ворагам.

«Брацкае прывітанне вялікаму кітайскаму народу, які змагаецца за сваю незалежнасць супроць японскіх і іншых захватчыкаў».

Позіркі антыфашыстаў усяго свету, усіх барацьбітоў за мір і свабоду звернуты да СССР—крэпасці сусветнай рэволюцыі. Магутным, несакрушальным уцёсам высіцца ён сярод мора крыві, слёз і жабрацтва. Свабодным і шчаслівым сустракае вялікі совецкі народ 1 мая. Са спакойнай упэўненасцю ў свае сілы будуе ён социялістычную грамадскасць. На варце мірнай социялістычнай працы, на варце свяшчэнных совецкіх граніц стаіць непераможная Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот.

«Мы стаім за мір і адстайваем справу міру. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на удар падпальшчыкаў вайны» (Сталін). Несакрушальная магутнасць Совецкага Саюза і паслядоўная мірная палітыка ператварылі СССР у магутны аплот міру ва ўсім свеце. Совецкі Саюз — ударная брыгада сусветнага пролетарыята, прыклад барацьбы і перамог якой натхняе на подвігі і перамогі мільёны людзей на ўсім земным шары.

Іменна таму так ненавідзяць фашысцкія канібалы нашу радзіму, іменна таму рыхтуюць напад на яе. Совецкі народ павінен заўсёды памятаць, што пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, пагроза вайны не ліквідавана і трэба ўсямерна мацаваць нашу любімую Чырвоную Армію, Чырвоны Флот і авіяцыю.

«Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку».

Ва ўмовах, калі фашызм вядзе шалёнае наступленне на працоўных, калі ён ліхаманкава рыхтуецца да нападу на краіну социялізма, трэба памятаць указанні таварыша Сталіна аб інтэрнацыянальнай салідарнасці, даныя ім у адказе тав. І. Ф. Іванову.

«Узмацнім і ўмацуем інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам капіталістычных краін. Вышэй сцяг міжнароднай пролетарскай салідарнасці!»

Гэта—ганаровая задача кожнага працоўнага вялікай краіны Советаў.

Партыя і совецкі народ разграмілі контррэволюцыйныя трацкісцка-бухарынскія шпіёнскія гнёзды ў нашай краіне. Але гэта ні ў якай меры не азначае, што барацьба з фашысцкай агентурай ужо скончана. Нельга ні на мінуту паслабляць большэвіцкай пільнасці. Пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, да нас будуць пачкамі засылаць шкоднікаў, шпіёнаў і дыверсантаў. І таму...

«Узмоцнім рэволюцыйную пільнасць. Пакончым з палітычнай бесклапотнасцю ў нашым асяроддзі!»

Знішчым ворагаў народа—наймітаў замежных разведак!

Да першамайскіх свят наша краіна прыходзіць з велізарнейшымі гаспадарчымі перамогамі. Наша социялістычная прамысловасць, магутны стаханаўскі рух паказалі сваю сілу і невычарпальныя магчымасці. Стаханаўцы социялістычных палёў паказваюць цуды працоўнага гераізма ў барацьбе за высокія сталінскія ўраджаі. У гэтым годзе краіна ўшчыльную падыйшла да ажыццяўлення лозунга таварыша Сталіна аб 7—8 мільярдах пудоў хлеба. Наша цудоўная радзіма расце, багацее і квітнее з кожным днём, кожнай гадзінай.

Вялікае свята Першага мая мы сустракаем пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі, ва ўмовах падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўныя Советы саюзных рэспублік.

У незабыўны дзень — 12 снежня 1937 г., дзень выбараў у Вярхоўны Совет СССР, — совецкі народ паказаў усяму свету сваё несакрушальнае маральна - палітычнае адзінства, магутную сілу блока комуністаў і беспартыйных, сваю згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна, сваю бязмежную любоў да вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна. Няма сумнення, што і зараз, у часе выбараў у Вярхоўны Совет БССР, народы Совецкай Беларусі і іншых саюзных рэспублік пакажуць усю магутнасць сталінскага блока, пашлюць у вышэйшы орган совецкай улады доблесных патрыётаў нашай радзімы, непахісных барацьбітоў за шчасце рабочых і сялян, за социялізм.

Лозунгі Цэнтральнага Камітэта мабілізуюць працоўных на барацьбу за далейшыя перамогі социялізма. Яны выражаюць усю веліч нашай сталінскай эпохі, усю магутнасць совецкага ладу, усю сілу вялікай краіны Советаў, азаронай светлымі праменнямі Сталінскай Канстытуцыі.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР.

АБ ВЫДАЧЫ ДАПАМОГІ СЯМ'І НЯБОЖЧЫКА КАМПАЗІТАРА МАГАМАЕВА М.

Выдаць сям'і нябожчыка кампазітара Магамаева Муслума, аўтара оперы «Наргіз», адначасовую дапамогу ў разм еры 20 тыс. рублёў.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 17 красавіка 1938 г.

Узнагароджанне праф. В. П. Філатава

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР пастанавіў:

За выдатныя заслугі ў галіне медыцыны ўзнагародзіць прафесара **Філатава** Владзіміра Петровіча ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ЛОЗУНГІ ДА 1 МАЯ 1938 г.

1. Няхай жыве 1-е мая—баявы агляд рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята!

2. Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся! Станавіцеся пад інтэрнацыянальны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна!

3. Братам па класу, вязням капітала, афярам крывавага фашысцкага тэрора, барацьбітам за перамогу рабочага класа ў дзень 1 мая наша пролетарскае прывітанне!

4. Фашызм—гэта тэрарыстычная палітыка капіталістаў і памешчыкаў супроць рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі. Фашызм — гэта захватніцкая вайна. Фашызм—злейшы вораг дружбы паміж народамі свету. Мабілізуем сілы на барацьбу з фашызмам!

5. Рабочыя, работніцы, сяляне і працоўныя ўсіх краін! Пашырайце і ўмацоўвайце народны фронт барацьбы супроць фашызма і вайны! За мір, за дэмакратычныя свабоды, за социялізм!

6. Барацьба іспанскага народа супроць унутранага і замежнага фашызма — агульная справа ўсяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва. Прывітанне гераічнаму іспанскаму народу, які змагаецца за сваю незалежнасць і свабоду!

7. Брацкае прывітанне вялікаму кітайскаму народу, які змагаецца за сваю незалежнасць супроць японскіх і іншых захватчыкаў!

8. «Мы стаім за мір і адстайваем справу міру. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны» (Сталін).

9. Няхай жыве наша родная, непераможная Чырвоная Армія, магутны аплот мірнай працы народаў СССР, верны страж заваяванняў Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі!

10. Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР!

11. Баявое прывітанне маладым байцам Чырвонай Арміі, прысягаючым 1 мая на вернасць совецкай уладзе, на вернасць нашай вялікай социялістычнай радзіме!

12. Няхай жыве Ваенна-Марскі Флот СССР — надзейная ахова марскіх граніц нашай радзімы!

13. Няхай жывуць совецкія лётчыкі, гордыя сокалы нашай радзімы, якія дабіліся сусветных авіяцыйных рэкордаў!

14. Прывітанне байцам-пагранічнікам, зоркім часавым краіны социялізма!

15. Няхай растуць і мацнеюць, няхай авалодваюць тэхнікай і загартоўваюцца наша родная, магутная Чырвоная Армія, Ваенна-Марскі Флот і Чырвоная авіяцыя!

16. Узмоцнім і ўмацуем інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам капіталістычных краін! Вышэй сцяг міжнароднай пролетарскай салідарнасці!

17. Няхай жыве саюз рабочых і сялян—аснова совецкай улады!

18. Царская Расія была турмой народаў. У совецкай краіне расце і мацнее вялікі саюз роўнапраўных народаў. Няхай жыве брацкі саюз і вялікая дружба народаў СССР!

19. Няхай жыве маральнае і палітычнае адзінства совецкага народа, заваяваўшага свабоду і незалежнасць нашай радзімы пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі!

20. Сталінская Канстытуцыя — вынік барацьбы і перамог Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Няхай жыве Канстытуцыя перамогшага социялізма і сапраўднага дэмакратызма!

21. Ліквідуем поўнасцю ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі вынікі шкодніцтва права-трацкісцкіх наймітаў замежных разведак! Ператворым СССР у непрыступную крэпасць социялізма!

22. Многамільённай арміі ўдарнікаў і ўдарніц прамысловасці і транспарта, стаханаўцам і стаханаўкам, — знатным людзям нашай краіны — большэвіцкае прывітанне!

23. Даб'емся выканання і перавыканання гаспадарчага плана 1938 года—першага года трэцяй пяцігодкі! Разгорнем шырэй магутны стаханаўскі рух!

24. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі цяжкай індустрыі і машынабудаўніцтва! За высокую здабычу вугалю, нафты, метала, за своечасовы выпуск лепшых машын, якія з'яўляюцца асновай развіцця народнай гаспадаркі краіны!

25. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі абароннай прамысловасці! Мацуйце абаронную магутнасць нашай радзімы! Узбройвайце родную Чырвоную Армію навейшай тэхнікай!

26. Рабочыя і работніцы, камандзіры і інжынеры лёгкай прамысловасці! Больш паркалю, шоўку, сукна, трыкатажа, абутку грамадзянам совецкай краіны! Змагайцеся за паляпшэнне якасці прадукцыі!

27. Прывітанне стаханаўцам социялістычных палёў, па-большэвіцку выконваючым план веснавой сяўбы!

28. Калгаснікі і калгасніцы, аграномы і работнікі соўгасаў! Змагайцеся за ўзорнае завяршэнне веснавой сяўбы і высокі ўраджай! Няхай жыве заможнае і культурнае жыццё калгасаў і калгаснікаў!

29. Узнімем культурна-тэхнічны ўзровень рабочага класа да ўзроўню работнікаў інжынерна-тэхнічнай працы!

30. Палкае прывітанне героям-папанінцам, адважным заваявальнікам Паўночнага полюса, дастойным сынам социялістычнай радзімы!

31. За далейшы росквіт культуры народаў СССР, за новыя поспехі і заваяванні совецкай навукі, тэхнікі і мастацтва!

32. Няхай жыве роўнапраўная жанчына СССР, актыўная ўдзельніца ў кіраванні дзяржавай, гаспадарчымі і культурнымі справамі краіны!

33. Піонеры і піонеркі! Навучаючыяся совецкай школы! Авалодвайце ведамі, вучыцеся стаць барацьбітамі за справу Леніна—Сталіна!

34. Слаўным фізкультурнікам і фізкультурніцам совецкай краіны—першамайскае прывітанне!

35. Няхай жыве комсамол — магутны рэзерв і надзейны памочнік большэвіцкай партыі! Няхай жыве працоўная моладзь нашай радзімы!

36. Шырэй разгорнем крытыку і самакрытыку нашых недахопаў! Умацуем магутнасць социялістычнай дзяржавы рабочых і сялян!

37. «Сувязь з масамі, умацаванне гэтай сувязі, гатоўнасць прыслухоўвацца да голасу масы, — вось у чым сіла і непераможнасць большэвіцкага кіраўніцтва» (Сталін).

38. Узмоцнім рэволюцыйную пільнасць! Пакончым з палітычнай бесклапотнасцю ў нашым асяроддзі!

39. Выкаранім ворагаў народа—трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных шпіёнаў і шкоднікаў, наймітаў замежных разведак! Смерць здраднікам радзімы!

40. Выкрыем усіх і ўсякіх двурушнікаў! Ператворым нашу партыю ў непрыступную крэпасць большэвізма!

41. Рабочыя і сяляне! Разгортвайце выбарчую кампанію! Вылучайце сумесна ў Вярхоўныя Советы Саюзных і Аўтаномных Совецкіх Социялістычных Рэспублік лепшых людзей, адданых да канца справе Леніна—Сталіна!

42. Працоўныя СССР! Выбірайце ў Вярхоўныя Советы Саюзных і Аўтаномных Совецкіх Социялістычных Рэспублік доблесных патрыётаў нашай радзімы, непахісных барацьбітоў за шчасце рабочых і сялян, за социялізм!

43. Комуністы! Мацней сувязь з беспартыйнымі масамі. Галоўнае ў выбарчай кампаніі—не адмяжоўвацца ад беспартыйных, а дзейнічаць разам з беспартыйнымі і сумесна з імі вылучаць кандыдатаў у Вярхоўныя Советы Саюзных і Аўтаномных Совецкіх Социялістычных Рэспублік!

44. Няхай жыве блок комуністаў і беспартыйных у надыходзячых выбарах Вярхоўных Советаў Саюзных і Аўтаномных Совецкіх Социялістычных Рэспублік!

45. Няхай жыве і мацнее наша магутная радзіма — Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік!

46. Няхай жыве Ўсесаюзная Комуністычная партыя большэвікоў — перадавы атрад працоўных СССР!

47. Няхай жыве Комуністычны Інтэрнацыянал—кіраўнік і арганізатар барацьбы супроць вайны, фашызма і капіталізма! Няхай жыве комунізм!

48. Няхай жыве вялікі, непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна! Няхай жыве ленінізм!

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў)

АБ ЗАБАРОНЕ ВЫКЛЮЧЭННЯ КАЛГАСНІКАЎ З КАЛГАСАЎ

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

СНК СССР і ЦК ВКП(б) неаднаразова папярэджвалі мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі аб шкодзе агульнага выключэння калгаснікаў з калгасаў. СНК СССР і ЦК ВКП(б) неаднаразова ўказвалі, што такая практыка з'яўляецца процідзяржаўнай. Не гледзячы на гэта, ва многіх абласцях, краях і рэспубліках маюць месца факты незабгрунтаванага выключэння калгаснікаў з калгасаў. Асабліва шырокія размеры набылі перагібы і скажэнні пры выключэнні калгаснікаў з калгасаў у Свердлоўскай, Новасібірскай, Смаленскай, Калінінскай, Каменец-Падольскай, Жытомірскай абласцях, у Алтайскім, Краснадарскім, Орджанікідзеўскім краях і Казахскай ССР. СНК СССР і ЦК ВКП(б) падкрэсліваюць, што шкодная практыка выключэння з калгасаў мае месца і ў іншых абласцях.

Практыка паказвае, што праўленні і старшыні калгасаў замест таго, каб захоўваць статут сельгасарцелі і недапускаць свавольства ў адносінах да калгаснікаў, самі з'яўляюцца носьбітамі незаконных дзеянняў. Праверкай устаноўлена, што пераважная большасць выключэнняў з калгасаў з'яўляецца зусім неабгрунтаванай і праводзіцца без якіх-небудзь сур'ёзных повадаў, па самых малаважных матывах. Найбольш распаўсюджаным відам незаконных выключэнняў з калгасаў з'яўляецца выключэнне з калгасаў членаў сямей, бацькі якіх пайшлі на часовую або пастаянную работу ў дзяржаўныя прадпрыемствы. Такое выключэнне з калгасаў па прызнаку сямейных сувязей ў корані супярэчыць статуту сельскагаспадарчай арцелі.

Статут сельскагаспадарчай арцелі раней, чым дазволіць выключэнне з калгаса, прадугледжвае рад прамежных папераджальных мер выхаваўчага характару ў адносінах асобных калгаснікаў, парушаючых унутраны распарадак калгаса, напрыклад, абавязаць парушальніка перарабіць нядобраякасную работу без налічэння працадзён, папярэджанне, вымова, ганьбаванне на агульным сходзе, занясенне на чорную дошку, штраф у размеры да 5 працадзён, перамяшчэнне на ніжэйшую работу, часовае адхіленне ад работы. Але праўленні калгасаў чамусьці не скарыстоўваюць гэтых мер і скрозь і ўсюды выключаюць калгаснікаў з калгасаў за простае парушэнне правіл унутранага распарадку ў калгасе.

Калі па статуту сельгасарцелі выключэнне з арцелі можа быць праведзена толькі па рашэнню агульнага схода членаў арцелі і пры тым пры абавязковым удзеле не менш ²/₃ усіх членаў арцелі, то на справе гэта статутнае правіла скрозь і ўсюды парушаецца і нярэдкі выпадкі, калі выключэнне праводзіцца праўленнем калгаса і нават адным старшынёй калгаса.

Кіруючыя партыйныя і совецкія работнікі раёнаў замест таго, каб стрымліваць і выпраўляць падобную шкодную практыку выключэння з калгасаў, не прымаюць рашучых мер да прысячэння свавольства, дапускаемага ў адносінах да калгаснікаў, бяздушна-бюракратычна адносяцца да лёсу калгаснікаў і іх апеляцый на незаконныя выключэнні з калгасаў, пакідаюць беспакаранымі асоб, праявіўшых свавольства ў адносінах да калгаснікаў і зводзяць нярэдка ўсю сваю ролю да простага запісу фактаў выключэння калгаснікаў з калгасаў, да перадачы вышэйстаячым совецкім органам статыстычнай справаздачнасці па гэтых пытаннях. Больш таго, гэтыя работнікі самі часта штурхаюць старшынь і праўленні калгасаў на шлях незаконных выключэнняў калгаснікаў з калгасаў пад сцягам ачышчэння калгасаў ад социяльна-чужых і класава-варожых элементаў.

СНК СССР і ЦК ВКП(б) лічаць, што ў аснове такой практыкі ляжаць фармальныя і бяздушна-бюракратычныя адносіны многіх кіруючых работнікаў калгасаў, а таксама партыйных і совецкіх кіраўнікоў раёнаў да лёсу жывых людзей, да лёсу асобных калгаснікаў. Такія кіраўнікі не разумеюць, што выключыць калгасніка з калгаса, значыць адняць у яго крыніцу існавання, значыць не толькі аганьбіць яго ў грамадскай думцы, але і асудзіць яго на галоднае існаванне. Яны не разумеюць, што выключэнне з калгаса штучна стварае незадаволенне і азлабленне ў выключаемых з калгасаў, параджае ў многіх калгаснікаў няўпэўненасць у іх становішчы ў калгасе, што не можа не адыгрываць на руку ворагам народа.

СНК СССР і ЦК ВКП(б) пастанаўляюць:

1. Забараніць правядзенне чысткі калгасаў пад якім-бы та ні было прадлогам.

2. Забараніць выключэнне з калгасаў членаў сямей калгаснікаў па матывах уходу аднаго з членаў сямей на часовую або пастаянную работу ў дзяржаўныя прадпрыемствы.

3. Забараніць выключэнне з калгасаў за парушэнне правіл унутранага распарадку.

4. Устанавіць надалей, што выключэнне калгаснікаў з калгасаў можа прымяняцца толькі, як крайняя мера, у адносінах членаў калгаса, яўна няспраўмых, падрываючых і дэзарганізуючых калгас і толькі пасля таго, як вычарпаны ўсе прадугледжаныя статутам сельгасарцелі меры папераджальнага выхаваўчага характару і толькі са строгім захаваннем устаноўленага статутам сельгасарцелі парадку выключэння, г. зн. па рашэнню агульнага схода членаў арцелі, на якім прысутнічае не менш 2/3 агульнага ліку членаў арцелі.

Аднак і ў гэтых выпадках павінны быць забяспечаны самыя ўважлівыя адносіны да апеляцый выключаных з калгасаў.

5. Устанавіць, што рашэнне агульнага схода членаў калгаса аб выключэнні калгасніка з калгаса не ўступае ў сілу і калгаснік захоўвае поўнасцю ўсе правы члена калгаса надалей да канчатковага разгляду гэтага рашэння райвыканкомам.

6. Папярэдзіць старшынь і членаў праўленняў калгасаў, а таксама раённых партыйных і совецкіх работнікаў, што за парушэнне гэтай пастановы вінаватыя будуць прыцягвацца да суда, як крымінальныя злачынцы.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР **В. МОЛАТАЎ**

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) **І. СТАЛІН**

19 красавіка, 1938 г.

АБ НЯПРАВІЛЬНЫМ РАЗМЕРКАВАННІ ДАХОДАЎ У КАЛГАСАХ

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) адзначаюць, што ў рэзультаце поўнай перамогі калгаснага ладу і павышэння ўраджайнасці калгасных палёў, значна ўзрэслі як агульны даход у калгасах, так і даходы калгаснікаў па працаднях.

У той-жа час Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) устанаўляюць на аснове шматлікіх фактаў, што ў калгасах раду абласцей, краёў і рэспублік грашовыя даходы размяркоўваюцца няправільна, у прамым супярэчанні з палітыкай урада і партыі і інтарэсамі калгаснікаў. Праўленні калгасаў, пры прамым патуранні з боку партыйных і совецкіх арганізацый раёнаў, абласцей, краёў і рэспублік, асноўную долю даходаў затрачваюць на пабудову грамадскіх будоўляў у калгасах, на вытворчыя і адміністратыўныя выдаткі, у выніку чаго доля грашовых даходаў, размяркоўваемых на працадні калгаснікаў, аказваецца заніжанай, што часта штурхае калгаснікаў на пошукі грашовых заработкаў па-за калгасам, а самі калгасы нярэдка церпяць ад недахопу рабочай сілы.

Напрыклад, у Татарскай АССР па 172 калгасах на працадні ў сярэднім размеркавана толькі 28 проц. даходаў; у Горкаўскай вобласці па 1279 калгасах размеркавана на працадні толькі 33 проц. грашовых даходаў калгасаў. У некаторых абласцях і рэспубліках (Растоўская, Варонежская і Разанская вобласці, Казахская ССР і інш.) ёсць калгасы, у якіх грашовыя даходы ў 1937 годзе зусім не размяркоўваліся па працаднях.

Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) маюць значную колькасць фактаў аб аналагічным становішчы спраў і па цэламу раду іншых абласцей, краёў і рэспублік.

Замест пастаянных клопатаў аб павышэнні працадня калгаснікам і правільным спалучэнні асабістых інтарэсаў калгаснікаў з грамадскімі інтарэсамі ў калгасе, праўленні калгасаў захапіліся капітальным будаўніцтвам, празмернымі вытворчымі выдаткамі і затратамі на адміністратыўна-гаспадарчае кіраванне ў калгасах. Доля адлічэнняў у непадзельныя фонды, затраты на адміністратыўна-гаспадарчыя патрэбы і выдаткі на культурныя патрэбы не толькі не зменшыліся, а, наадварот, значна перавышаюць устаноўленыя статутам сельскагаспадарчай арцелі нормы.

Статут сельскагаспадарчай арцелі патрабуе, каб праўленні калгасаў выдаткоўвалі сродкі толькі ў тых размерах і па тых артыкулах, якія прадугледжаны зацверджаным агульным сходам калгаснікаў каштарысам. На практыцы-ж многія праўленні калгасаў, па-першае, самі каштарысы складаюць з завышанымі расходамі, па-другое, зусім не лічацца з ужо зацверджаным каштарысам, не пытаючы агульны сход калгаснікаў, самавольна перасоўваюць сродкі з аднаго артыкула ў другі і выдаткоўваюць сродкі без ўчоту выканання плана па даходу. Такія старшыні калгасаў і праўленні калгасаў забываюць, што яны не маюць права самастойна змяняць зацверджаны каштарыс без згоды калгаснікаў, праводзіць тыя ці іншыя выдаткі, забываюць, што яны з'яўляюцца людзьмі—цалкам падсправаздачнымі агульнаму сходу калгаса. А рэвізійныя камісіі, як правіла, бяздзейнічаюць або ператвараюцца ў падсобны апарат праўлення для вынясення фармальнага заключэння па справаздачы к канцу года.

Статут сельскагаспадарчай арцелі патрабуе, каб усе работы ў калгасах выконваліся членамі калгаса і толькі ў асоба выключных выпадках дапускаўся часовы наём рабочай сілы. На справе-ж ёсць нямала фактаў, калі ў выніку дрэннай арганізацыі працы, праўленні калгасаў затрачваюць значныя сродкі грашыма і натурай на наём рабочай сілы звонку, што прыводзіць да разбазарвання калгасных сродкаў і зніжэння калгасных даходаў.

Замест таго, каб клапатліва адносіцца да правільнага выкарыстоўвання, хавання і рэалізацыі атрымліваемай у калгасе прадукцыі для павышэння грашовых даходаў калгаса, нярэдка праўленнямі некаторых калгасаў на працягу ўсяго года праводзіцца асуджаная партыяй і ўрадам практыка растранжырвання калгаснай прадукцыі на выдачу як унутры калгаса, так і па-за калгасам па нізкіх цэнах або эўсім дарэмна. Хаванне прадукцыі пастаўлена неахайна, што выклікае масавае псаванне прадуктаў, а, як агульны рэзультат, — на працадні ў такіх калгасах грашовая выдача калгаснікам аказваецца нізкай.

Кіраўнікі абласных, краявых, рэспубліканскіх і раённых партыйных і совецкіх органаў, замест таго, каб прысячы парушэнне статута сельскагаспадарчай арцелі і ўшчамленне асабістых інтарэсаў калгаснікаў па сутнасці справы патакалі гэтай процікалгаснай практыцы.

Партыйныя і совецкія работнікі раёнаў, абласцей, краёў і рэспублік не разумеюць самі і не растлумачваюць калгасам таго, што значным ростам даходаў у калгасах і ўмацаваннем іх грамадскіх фондаў у выглядзе будоўляў, жывёлы, машын (пры абслугоўванні калгасаў машынамі МТС), створана ўжо поўная магчымасць да таго, каб скараціць адлічэнні з даходаў калгасаў у іх грамадскія фонды, на капітальныя і вытворчыя затраты і вялікую частку калгасных грашовых даходаў размяркоўваць на працадні.

Партыйныя і совецкія кіраўнікі раёнаў, абласцей і рэспублік забываюць, што такая практыка бесклапотных адносін да задачы павышэння працадня, да фактаў растранжырвання і раскрадання калгасных сродкаў, аб'ектыўна ёсць практыка процікалгасная і шкодніцкая.

Нашы партыйныя і совецкія кіраўнікі абавязаны памятаць, што ў радзе месц на штучнае раздуванне вытворчых і капітальных затрат у калгасах і заніжэнне грашовых даходаў, размяркоўваемых па працаднях, свядома штурхалі сядзеўшыя ў зямельных і іншых органах ворагі народа ў правакацыйных мэтах, каб падарваць калгасы.

Совет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) пастанаўляюць:

1. Асудзіць практыку бесклапотных адносін да працадня калгаснікаў і растранжырванню калгасных даходаў на празмерныя капітальныя, вытворчыя і адміністратыўна-гаспадарчыя выдаткі, як антыкалгасную. Абавязаць абкомы, крайкомы і ЦК нацкомпартый на справе рашуча пакончыць з гэтай практыкай.

2. Адмяніць існуючы парадак размеркавання грашовых даходаў арцелі, прадугледжаны ў статуце сельскагаспадарчай арцелі, устанавіўшы надалей, што арцель размяркоўвае паміж калгаснікамі на працадні не менш 60—70 проц. усіх грашовых даходаў арцелі.

3. Устанавіць, што адлічэнні на капітальныя затраты не могуць перавышаць 10 процантаў грашовых даходаў, пры чым сродкі на капітальныя затраты ў бягучым годзе адлічваюцца з даходаў прайшоўшага года.

4. Устанавіць, што з зацверджанага агульным сходам калгаснікаў гадавога расходнага каштарыса на вытворчыя патрэбы калгаса, праўленне да канчатковага высвятлення відаў на ўраджай можа выдаткоўваць не больш 70 проц. прадугледжаных каштарысам расходаў. Астатнія 30 проц. астаюцца ў рэзерве і выдаткоўваюцца толькі пасля канчатковага высвятлення відаў на ўраджай і пасля рашэння агульнага схода калгаснікаў.

У адпаведнасці з гэтым змяніць артыкул 12 статута сельскагаспадарчай арцелі і падаць яго ў наступным выглядзе:

«12. З АТРЫМЛІВАЕМЫХ АРЦЕЛЛЮ ГРАШОВЫХ ДАХОДАЎ АРЦЕЛЬ:

а) Уносіць дзяржаве ўстаноўленыя законам падаткі і праводзіць страхавыя плацяжы;

б) размяркоўвае не менш 60—70 проц. грашовых даходаў арцелі паміж членамі арцелі па працаднях;

в) праводзіць неабходныя расходы на бягучыя вытворчыя патрэбы, як-та: бягучы рамонт сельскагаспадарчых прылад, лячэнне жывёлы, барацьба са шкоднікамі і т. п.;

г) пакрывае адміністратыўна-гаспадарчыя расходы арцелі, выдзяляючы на гэта не больш двух процантаў грашовых расходаў;

д) выдзяляе сродкі на культурныя патрэбы, як-та: падрыхтоўка брыгадзіраў і іншых кадраў, арганізацыя ясляў, пабудова радыё;

е) папаўняе недзялімы фонд арцелі для ўтварэння выдаткаў у надыходзячым годзе на пакупку сельскагаспадарчых прылад і жывёлы, аплату будаўнічых матэрыялаў, расплаты з рабочымі, якія прыцягнуты на будаўніцтва з боку, на чэковы ўзнос сельскагаспадарчаму банку па доўгатэрміновых крэдытах, пры чым адлічэнне на папаўненне недзялімых фондаў праводзіцца ў размеры не звыш 10 процантаў грашовых даходаў арцелі.

Усе даходныя паступленні абавязкова запісваюцца ў прыход арцелі не пазней дня іх паступлення.

Як на даходныя паступленні, так і на выдаткаванне сродкаў праўленнем арцелі складаецца гадавы каштарыс, які ўступае ў сілу толькі пасля зацверджання агульным сходам членаў арцелі.

Выдаткаванне сродкаў праўленне можа праводзіць толькі па тых артыкулах, якія прадугледжаны каштарысам, — самавольная перасоўка сродкаў з артыкула ў артыкул расходнага каштарысу праўленнем не дапускаецца і для перасоўкі сродкаў з артыкула ў артыкул праўленне абавязана запытаць дазвол агульнага схода.

З зацверджанага агульным сходам калгаснікаў гадавога расходнага каштарыса на вытворчыя патрэбы калгаса, праўленне да канчатковага высвятлення відаў на ўраджай можа выдаткоўваць не больш 70 проц. прадугледжаных каштарысам расходаў. Астатнія 30 процантаў астаюцца ў рэзерве і выдаткоўваюцца толькі пасля канчатковага высвятлення відаў на ўраджай і пасля рашэння агульнага схода калгаснікаў.

Свае свабодныя грашовыя сродкі арцель хавае на сваім бягучым рахунку ў банку або ў ашчадкасе. Спісанне з бягучага рахунку праводзіцца толькі па загаду праўлення арцелі, які сапраўдны пры наяўнасці подпісу старшыні і рахункавода арцелі».

5. Устанавіць парадак, пры якім каштарысы кожнага калгаса пасля іх зацверджання агульным сходам уносяцца на разгляд прэзідыума раённага выканаўчага камітэта, які разгледжвае ўнесены каштарыс у прысутнасці старшыні праўлення і старшыні рэвізійнай камісіі калгаса.

6. Устанавіць, што наём вольнанаёмнай рабочай сілы ў калгасе ў выключных выпадках, як гэта прадугледжана статутам сельскагаспадарчай арцелі, можа быць праведзен толькі са згоды агульнага схода калгаснікаў. Абавязаць сакратароў райкомаў ВКП(б) і старшынь райвыканкомаў не дапускаць злоўжыванняў і парушэння пункта 13 статута сельскагаспадарчай арцелі, забараняючага карыстацца наёмнай працай з некалгаснікаў, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных даным артыкулам.

7. Абавязаць абкомы, крайкомы і ЦК нацкомпартый аднавіць работу рэвізійных камісій ва ўсіх калгасах з тым, каб рэвізійныя камісіі праводзілі сваю рэвізійную работу на працягу ўсяго года, як гэтага патрабуе статут, а не абмяжоўваліся дачай фармальнага заключэння па справаздачы праўлення толькі ў канцы года.

8. Устанавіць, што аддзяленні дзяржаўнага і сельскагаспадарчага банкаў выдаюць калгасам крэдыты толькі ў тым выпадку, калі ёсць на гэта рашэнне агульнага схода калгаснікаў.

9. Абавязаць абкомы, крайкомы, ЦК нацкомпартый, абласныя, краявыя выканкомы і соўнаркомы рэспублік, а таксама пракураў прыцягваць да крымінальнай адказнасці асоб, вінаватых у незаконным выдаткоўванні калгасных сродкаў, якія ідуць у парушэнне статута сельскагаспадарчай арцелі і інтарэсаў калгаснікаў, разгледжваючы гэтыя дзеянні, як здраду справе калгасаў і дапамогу ворагам народа.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР **В. МОЛАТАЎ**

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) **І. СТАЛІН.**

19 красавіка 1938 года.

АБ ПАДАТКАХ І ІНШЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАХ У АДНОСІНАХ АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

На падставе шматлікіх фактаў СНК СССР і ЦК ВКП(б) устанаўліваюць, што партыйнымі і совецкімі органамі ў рэспубліках, краях і абласцях парушаецца палітыка і пастановы ўрада і партыі ў адносінах аднаасобнікаў. Совецкімі законамі ўстаноўлены дзяржаўныя абавязацельствы для аднаасобных гаспадарак па падатках, зернапастаўках і мясапастаўках. Аднак, замест таго, каб забяспечваць выкананне аднаасобнымі гаспадаркамі дзяржаўных абавязацельстваў, устаноўленых законам, — мясцовыя партыйныя і совецкія органы дапускаюць становішча, пры якім аднаасобнікі фактычна ўскальзаюць ад выканання дзяржаўных абавязацельстваў. Па раду абласцей і краёў аднаасобнікі зусім не прыцягваюцца да мясапаставак, выкананне-ж параённых заданняў па мясапастаўках ускладаецца на калгасы. Такім чынам, совецкія і партыйныя арганізацыі фактычна ставяць аднаасобныя гаспадаркі ў пераважнае становішча перад калгасамі, што ў корані супярэчыць існуючым законам.

Коні ў аднаасобных гаспадарках, не абкладаемыя падаткам, выкарыстоўваюцца аднаасобнікамі, як правіла, не для правядзення сельскагаспадарчых работ у сваёй гаспадарцы, а як сродак спекуляцыі і нажывы.

Праўленні калгасаў пры патуранні раённых совецкіх і партыйных органаў, парушаючы статут сельскагаспадарчай арцелі, скрозь і ўсюды прыбягаюць да найму аднаасобнікаў для работы ў калгасах, даючы ім больш высокую аплату, чым прыходзіцца калгаснікам на працадні, што не можа не падрываць дысцыпліну ў калгасах.

У выніку такіх няправільных адносін да аднаасобных гаспадарак наносіцца прамая страта справе далейшага ўцягнення аднаасобных гаспадарак у калгасы.

Усё гэта сведчыць аб наяўнасці буйных памылак з боку совецкіх і партыйных органаў рэспублік, краёў і абласцей у адносінах да аднаасобніка.

СНК СССР і ЦК ВКП(б) **пастанаўляюць:**

1) Абавязаць ЦК нацкомпартый, крайкомы і абкомы, СНК рэспублік, аблвыканкомы і крайвыканкомы пакончыць з процідзяржаўнай і процікалгаснай практыкай патурання ў адносінах аднаасобніка і строга сачыць за дакладным выкананнем аднаасобнымі гаспадаркамі ўсіх дзяржаўных абавязацельстваў па падатках, зернапастаўках і мясапастаўках і т. д.

2) Аднавіць з 25 красавіка 1938 года дзяржаўны падатак на коней аднаасобных гаспадарак.

3) Абавязаць совецкія і партыйныя арганізацыі рэспублік, краёў і абласцей не дапускаць надалей ухілення ад нясення аднаасобнікамі ўсялякіх мясцовых павіннасцей (дарожныя работы, лесавываз, абслугоўванне школ, больніц і т. п.), тым самым не дапускаючы якой-бы та ні было перавагі аднаасобнікаў у параўнанні з калгаснікамі.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР **В. МОЛАТАЎ.**

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) **І. СТАЛІН.**

19 красавіка 1938 года.

У ЦК КП(б)Б і СНК БССР

ВЫВУЧЭННЕ РУСКАЙ МОВЫ Ў ШКОЛАХ БССР

Бюро ЦК КП(б)Б і Соўнарком БССР прынялі пастанову аб абавязковым вывучэнні рускай мовы ў школах БССР. Згодна рашэння бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР выкладанне рускай мовы, як прадмета вывучэння, ва ўсіх нерускіх школах Беларусі павінна быць уведзена з 1 верасня 1938 года. Вывучэнне рускай мовы ва ўсіх нерускіх пачатковых школах уводзіцца з другога класа і ва ўсіх няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах—з трэцяга класа. У адпаведнасці з гэтым уносяцца змены ў навучальныя планы нерускіх школ.

Наркамасветы прапанавана скласці і выдаць да 25 жніўня буквар, кнігі для чытання, граматыку рускай мовы, улічваючы асаблівасці вывучэння рускай мовы паасобнымі нацыянальнасцямі.

Для аказання дапамогі вучням у паспяховым вывучэнні імі рускай мовы бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР абавязалі Наркамасветы выдаць да 1 жніўня вучэбна-наглядныя дапаможнікі (арфаграфічныя таблі́цы, карціны па развіцю мовы), руска-беларускі і руска-яўрэйскі слоўнікі, серыю мастацкай дзіцячай літаратуры на рускай мове для класнага і некласнага чытання.

Наркамасветы прапанавана неадкладна арганізаваць падрыхтоўку настаўнікаў рускай мовы на кароткатэрміновых курсах у колькасці 760 чалавек і 6-месячных курсах — 330 чалавек, а таксама правесці ў перыяд летніх канікул перападрыхтоўку тысячы настаўнікаў рускай мовы і навучання рускай мове мясцовых нацыянальных настаўніцкіх кадраў, у даны момант ёю не ўладаючых.

З 1 верасня 1938 года ўводзіцца абавязковае вывучэнне рускай мовы ва ўсіх педагагічных вучылішчах, педагагічных інстытутах і універсітэце. Навучальныя планы і праграмы іх павінны быць перагледжаны з тым, каб асобы, канчаючыя педагагічныя навучальныя ўстановы, добра валодалі рускай мовай.

Для падрыхтоўкі з нацыянальных кадраў навуковых работнікаў у галіне рускай мовы, з 1 верасня пры менскім, магілеўскім і гомельскім педагагічных інстытутах ствараецца аспірантура з наборам 30 аспірантаў.

Пры Беларускім дзяржаўным універсітэце з 1 верасня павінна быць адкрыта трохгадовае аддзяленне беларускай і рускай моваў і літаратуры на 140 чалавек.

Бюро ЦК КП(б)Б і СНК БССР прапанавалі абкомам, гаркомам і райкомам КП(б)Б, аблвыканкомам і райвыканкомам арганізаваць пастаянны кантроль і праверку за пастаноўкай выкладання рускай мовы ў нерускіх школах БССР.

—о—

БЛІСКУЧЫЯ РЭКОРДЫ СОВЕЦКІХ ПЛАНЕРЫСТАЎ

17 красавіка спартыўная камісія Цэнтральнага аэраклуба СССР імя Косарэва разгледзела матэрыялы аб рэкордных палётах совецкіх планерыстаў маёра Л. Г. Мінава і лётчыка Н. І. Макарава. Гэтыя палёты былі зроблены Коктэбелі (Крым) на двухмесных планерах «Ш-П».

Лётчык Макараў разам з пасажырам Гадавіковым 9 красавіка пратрымаўся ў паветры на планеры 19 гадзін 08 мінут. Спартыўная камісія Цэнтральнага аэраклуба прызнала рэзультат гэтаго палёту ўсесаюзным рэкордам працяжнасці па другой катэгорыі (клас «Д»). Адначасова камісія рашыла прадставіць матэрыял аб палёце тт. Макарава і Гадавікова ў прэзідыум Міжнароднага авіяцыйнай федэрацыі (ФАІ) для зацвярджання яго як міжнароднага рэкорда.

Спартыўная камісія Цэнтральнага аэраклуба СССР пастанавіла таксама прызнаць усесаюзным рэкордам рэзультат высотнага палёту майстра совецкага планерызма, ордэнаносца Л. І. Мінава, зроблены ім 4 красавіка.

СОВЕЦКАЕ КАЗАЦТВА

—о—

Маёр ІВАНОЎ А. К.,
начальнік штаба казачага корпуса імя таварыша Сталіна.

—о—

Роўна два гады назад — 20 красавіка 1936 года Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР пастанавіў:

«Улічваючы адданасць казацтва совецкай уладзе, а таксама імкненне найшырэйшых мас казацтва нароўні з усімі працоўнымі Совецкага Саюза актыўным чынам уключыцца ў справу абароны краіны, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР пастанаўляе:

Адмяніць для казакаў усе раней існаваўшыя абмежаванні ў адносінах іх службы ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, апрача пазбаўленых права па суду».

Карэнныя змены ў нашай краіне і ў самым казацтве абумовілі выданне гэтай гістарычнай пастановы. Да Вялікай социялістычнай рэволюцыі прывілеяванае казацтва з'яўлялася ў руках царскага самадзяржаўя зброяй у барацьбе з рэволюцыйнымі выступленнямі народных мас. Вялікая социялістычная рэволюцыя ў кастрычніку 1917 года раскалола казацтва на дзве часткі. Многія казакі, перш за ўсё вярхушка казацтва—атаманы і афіцэрства перайшлі на бок контррэволюцыі і з'явіліся тым рэзервам, адкуль белыя генералы чэрпалі свае ўзброеныя сілы. Бяднейшая-ж частка казацтва — франтавікі — моцна стала на абарону завяванняў Кастрычніка. Уліваючыся ў атрады і часці Чырвонай Арміі, працоўныя казакі ўдзельнічалі ў разгроме «сваёй айчыннай» контррэволюцыі і іншаземных інтэрвентаў.

Справа, за якую было аддана столькі жыццяў, перамагла. Яна жыве ў радасці і шчасці перамогшага социялізма. У казачых станіцах Дона, Кубані і Терака, як і ва ўсёй нашай краіне, расквітнела новае, цудоўнае жыццё. Казацтва без атаманаў і афіцэраў, пераварыўшыся ў совецкім катле, стала зусім іншым. Казакі зразумелі, што толькі разам з усім працоўным народам нашай неабсяжнай радзімы можна пабудаваць шчаслівае жыццё, што для казацтва адзіны шлях — гэта шлях социялістычны.

Совецкая ўлада, комуністычная партыя, вялікі Сталін выхавалі новага чалавека социялістычнага грамадства. Выраслі тысячы стаханаўцаў-казакаў. Многія з іх удастоены вышэйшай узнагароды — ордэнаў Саюза ССР. Зараз казацтва — гэта такія-ж шчырыя патрыёты сваёй социялістычнай радзімы, як і ўвесь наш вялікі гераічны совецкі народ.

Пастанова ЦВК СССР аб знятці з казацтва абмежаванняў па службе ў РСЧА выклікала новую магутную хвалю совецкага патрыятызма. Ва ўсіх станіцах Дона, Терака, Кубані і Стаўропальшчыны адбыліся мітынгі, на якіх казацтва шчыра дзякавала партыю, урад і таварыша Сталіна за аказанае давер'е і яшчэ раз запэўніла, што яны не пашкадуюць ні сіл, ні здароўя, ні нават жыцця для абароны социялістычнай радзімы. У рады РСЧА прышлі тысячы маладых казакаў. Па загаду жалезнага наркома абароны, маршала краіны социялізма таварыша Варашылава былі створаны, шляхам рэарганізацыі кавалерыйскіх часцей спецыяльныя казачыя часці і злучэнні.

Для нас гэта дата з'яўляецца двайным юбілеем. У тым-жа 1936 годзе наш кавалерыйскі корпус, які мае ў сваім складзе старэйшыя дывізіі Першай коннай арміі, авеяныя неўвядальнай славай яшчэ ў часы грамадзянскай вайны, калі яны пад вадзіцельствам таварыша Варашылава грамілі белыя полчышчы. — удастоен высокага гонару. Корпус атрымаў **імя Сталіна**, імя таго, хто стварыў і выпеставаў Першую конную армію, натхняў яе на гістарычныя перамогі ў цяжкія дні грамадзянскай вайны. Гэтай найвышэйшай узнагароды мы дабіліся гераічнымі подвігамі на франтах грамадзянскай вайны, вялікай работай і дасягненнямі ў галіне баявой і палітычнай падрыхтоўкі нашых часцей.

Наш сталінскі казачы корпус камплектуецца зараз казакамі Дона, Кубані і Терака. У нас ёсць цэлыя эскадроны, укамплектаваныя з двух-трох станіц. Прышоўшы з калгасных палёў, казачая моладзь з энтузіязмам бярэцца за вайсковую справу, хутка асвойвае баявую тэхніку і ўмовы сучаснага бою.

Кожны дзень работы дае нам новых ударнікаў, выдатнікаў і стаханаўцаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Капітан Малышаў, лейтэнанты Пышкало і Гарбатаў часці Селюкова сваёй крапатлівай работай дабіліся пяршынства і выдатных паказальнікаў па сувязі. Яны заахвочаны ўдзячнасцю ў загадзе па корпусу.

Казакі часці тав. Старапетава, даўшыя добрыя і выдатныя паказальнікі па ўсіх відах баявой падрыхтоўкі, асабліва добрых рэзультатаў дабіліся па сувязі. Добрыя і выдатныя рэзультаты казакамі дасягнуты ў выніку вялікай работы камандзіраў і палітработнікаў гэтай часці. Камандзір эскадрона тав. Глухаў, на вачах якога ў часе грамадзянскай вайны белыя расцярзалі бацькоў, дабіўся выдатных рэзультатаў баявой падрыхтоўкі байцоў. Лейтэнант Бычанін, казакі Раманаў, Снісарэў, Палякоў, Сосіка, Нікалаеў, малодшы камандзір Ошарын і іншыя— перадавікі-стаханаўцы вучобы ў гэтай часці.

Часць тав. Лясніченка ў выніку ўпартай і крапатлівай работы ўсяго каманднага і начальніцкага складу дае выдатныя і добрыя паказальнікі баявой падрыхтоўкі, што адзначала на акруговых і армейскіх спаборніцтвах.

Асабліва трэба падкрэсліць выдатныя паказальнікі па артылерыйскай падрыхтоўцы. Загадам наркома адзначаны і ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі тт. Семункін, Тарыкаў, Сытнікаў, Осьмінкін і Зімоўцаў. Многа ўвагі аддаецца агнявой падрыхтоўцы. Казакі ўмеюць метка страляць з усіх відаў зброі.

Палітычная падрыхтоўка і штодзённая палітінфармацыя выхоўваюць казакаў у духу беззаветнай адданасці совецкай уладзе, комуністычнай партыі і правадыру народаў вялікаму Сталіну.

Растуць камандзірскія кадры. Маладыя камандзіры, вылучаныя на адказныя пасады, вельмі добра спраўляюцца з ускладзенымі на іх адказнейшымі абавязкамі. Прыкладаў дастаткова ў кожнай часці. Вось лейтэнант Палянін В. В. Ён працуе памочнікам камандзіра палка, выдатна спраўляецца са сваёй работай. Старшы лейтэнант Серыкаў В. М. — камандзір асобнага сапёрнага эскадрона — мае выдатныя поспехі ў падрыхтоўцы часці. Лейтэнант Сокалаў А. І. — памочнік начальніка штаба Н-скага казачага конна-артылерыйскага палка, — адукаваны і добра палітычна падрыхтаваны камандзір. Камандуючы раней батарэяй, паказаў узоры падрыхтоўкі байцоў.

На высокім узроўні стаіць у часцях корпуса конная падрыхтоўка. Пастаянна правадзімыя конна-спартыўныя спаборніцтвы з'яўляюцца неадлучнай часткай баявой падрыхтоўкі. Казакі і камандзіры на спаборніцтвах паказваюць ліхасць і адвагу, уменне валодаць агнём і зброяй. Лейтэнант Салронаў, старшы палітрук Прудніка́ў, капітан Кананенка, старшы лейтэнант Панасенка, палітрук Сычоў, старшыня Куруленка, маёр Пакроўскі, лейтэнант Кандзенка і многа іншых з'яўляюцца лепшымі наезнікамі корпуса. Многа клопатаў і ўвагі аддаецца догляду і захаванню каня — свайго баявога таварыша.

Высока пастаўлена страявая і фізічная падрыхтоўка. Як правіла, усе часці перакрываюць нарматывы па фізічнай падрыхтоўцы. Асабліва добра фізічная і страявая падрыхтоўка пастаўлена ў палкавых школах, якія выпускаюць выдатных страявых малодшых камандзіраў.

Маладыя казакі канкрэтнымі справамі даказваюць, што яны дастойны насіць вялікае імя казака-сталінца, на справе апраўдваюць вялікае давер'е, аказанае ім нашай партыяй і ўрадам.

Сталінскі корпус ганарыцца сваімі поспехамі. Мінулы навучальны год мы закончылі з добрай ацэнкай па ўсіх асноўных аддзелах баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

На апошніх вялікіх асенніх тактычных вучэннях часці корпуса паказалі ўменне весці бой у сучасных складаных умовах, ва ўзаемадзеянні з механізаванымі часцямі і авіяцыяй. Мы навучыліся змагацца з авіяцыяй і танкамі праціўніка, якія з'яўляюцца небяспечнейшымі ворагамі буйных конных часцей. Казакі паказалі вялікую выносласць, робячы вялікія напружаныя маршы. Байцы, камандзіры і палітработнікі самаадданай работай заслужылі тую дадатную ацэнку, якая дадзена наркомам абароны маршалам Совецкага Саюза тав. Варашылавым дзеянням казачых часцей на тактычных вучэннях.

Пры сустрэчах нашых казачых часцей з калгаснікамі Беларусі мы былі сведкамі найвялікшага яднання калгаснікаў і казакаў, натхнёных адзінымі парывам любві да вялікага Сталіна. Ранейшы сэнс слова — казакі, як апора парызма, які выклікаў законную нелюбасць у працоўных, назаўсёды адышоў у мінулае. Пры праходжанні сёлаў і вёсак на вучэннях адначасова вуснаў калгаснікаў і казакаў вырываліся словы: «Дзякуй таварышу Сталіну за радаснае, шчаслівае жыццё». У адказ адзінае дружнае «ура» калгаснікаў і казакаў выказвала найвялікшыя пяжкаперадаваемыя пачуцці яднання працоўных, магутнасці нашай краіны і радасці за шчаслівае жыццё за перамогі социялізма, дасягнутыя пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна.

Адзначаючы нашы дасягненні ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы часцей, успамінаючы дні, месяцы і годы грамадзянскай вайны, упісаўшыя залаты старонкі ў гісторыю перамог над ворагамі рэволюцыі, мы зараз, не трацячы сваёй большэвіцкай пільнасці, не заспакоюся дасягнутымі рэзультатамі, кожны дзень будзем умацоўваць сваю баявую магутнасць, каб заўсёды быць гатовымі знішчыць ворага.

Няхай ведаюць ворагі краіны социялізма, што наш казачы корпус нядарма носіць імя вялікага Сталіна. Там, дзе імя Сталіна, — там перамога.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ

ДА КАНЦА АЧЫСЦІЦЬ ТРАНСПАРТ АД ПРАВА-ТРАЦКІСЦКАГА АХВОСЦЯ

На справаздачна-выбарчым сходзе партарганізацыі Віцебскага чыгуначнага вузла.

ВІЦЕБСК. Тры дні комуністы Віцебскага чыгуначнага вузла абмяркоўвалі работу свайго парткома. Павышэнне ўзроўню ідэйнасці, барацьба за рэвалюцыйнай пільнасці, барацьба за квідацыю вынікаў шкодніцтва—з'яўляліся асноўнай тэмай разгарнуўшых спрэчак.

І гэта зразумела. Права-трацкісцкія шкоднікі, шпіёны і дыверсанты доўгі час падрывалі здароўе транспарта, наносілі яму вялікую шкоду. І тыя, пры абмеркаванні работы парткома, комуністы вузла, адзначаючы праведзеную работу, у той-жа час падкрэслівалі, што многае яшчэ недароблена.

Вельмі трапна на сходзе ацаніў сённяшняе становішча на транспарце тав. Маркелаў. — Галавы — гаворыць он, — гадам паадразалі, а хвасты яшчэ асталіся. Псаванне бандажэй, наўнасць адцэпак па прычыне згарання вушак, шкодніцкае фарміраванне паязноў, аварыі—усё гэта яшчэ мае месца на розных участках вузла і павярджае наяўнасць варожай работы.

— Усе службы вузла маюць вялікую работу ў розных матэрыялах. І ў той час як кладовыя ўчастковага матэрыяльнага склада завалены вострадэфіцытнымі матэрыяламі. Але, як відаць, на гэтым участку яшчэ і зараз мала нічога не робіцца па лініі ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Такое абвінавачанне прад'явіў на сходзе тав. Шапавалаў партарганізатар участковага матэрыяльнага склада (партарганізатар тав. Васількоў) і парткому вузла.

Слабая пастаноўка партыйна-масавай і палітычнай работы на вузле — вось асноўная прычына таго, што на радзе ўчасткаў большэвіцкая пільнасць яшчэ не знаходзіцца на належнай вышыні і вынікі шкодніцкай работы слаба ліквідуюцца. І зусім правільнае абвінавачанне парткому кінуў лепшы саставіцель паяздоў — стаханавец тав. Чэрапаў.

— Рашэнні лютаўска-сакавіцкага і студзеньскага пленумаў ЦК ВКП(б),— гаворыць тав. Чэрапаў, — яшчэ не сталі здабыткам усіх чыгуначнікаў вузла. Палітычная агітацыя на такіх участках, як станцыя Віцебск, таварны двор, вагонны ўчастак — разгорнута вельмі слаба. А на гэтых-жа ўчастках арудавалі махровыя ворагі народа.

Вельмі правільна заўважае памылкі парткома тав. Свірскі. За апошні час на вузле вылучана вялікая колькасць маладых, растучых партыйных і непартыйных большэвікоў на розныя гаспадарчыя і адміністрацыйныя адказныя пасады. У гэтым, вядома, вялікая заслуга парткома. Аднак, цэлы рад камандзіраў транспарта, як тт. Мхітараў, Крышачкін, Баўфаў, Міцошкін, Шостак і інш., не вучацца, не працуюць над павышэннем свайго палітычнага ўзроўню. І партком праходзіць міма гэтага факта.

Рад комуністаў вельмі правільна адзначалі, што большэвіцкая пільнасць прытуплена іменна там, дзе партарганізацыя не жыве поўнакроўным жыццём, дзе партыйная работа знаходзіцца на нізкім узроўні.

Асабліва востра крытыкавалі на сходзе партком за слабае кіраўніцтва комсамолам (тт. Крыўчонак, Ліберман і інш.). Гэта сказалася і на росце партыі за лік лепшых комсамольцаў. Дастаткова ўказаць, што за справаздачны перыяд з комсамольскай арганізацыі, якая налічвае 670 чалавек, прынята ў партыю толькі 22 комсамольцы.

Аднак, неабходна адзначыць, што партком з'явіўся прадзелам крытыкі. Вышэй парткома не падняліся. А належала-б большэвіцкую крытыку накіраваць і па адрасу парткома, і па адрасу палітаддзелаў. Гэта-ж нікому не сакрэт, што гарком партыі і палітаддзелы слепа штампавалі грубейшыя памылкі парткома вузла, дапушчаныя пры выключэнні комуністаў з партыі. Ды к таму-ж, штодзённага жывога кіраўніцтва партарганізацыяй вузла не было ні з боку гаркома партыі, ні з боку палітаддзела чыгункі.

Усяго запісалася ў спрэчках 60 чалавек. Выступіла 34. Сход прызнаў палітычную лінію парткома правільнай і практычную работу здавальняючай.

Нельга аднак, не падкрэсліць, што калі спрэчкі праходзілі пад знакам высокай палітычнай актыўнасці, то вельмі злёгку аднёсся сход да выпрацоўкі рашэння па справаздачы парткома.

Арганізавана было праведзена абмеркаванне кандыдатур у спіс для тайнага галасавання ў склад партыйнага камітэта, які быў намечан з 11 чалавек. Усяго было вылучана 8 кандыдатур. Па палітычных і дзелавых меркаваннях былі адведзены чатыры кандыдатуры. У рэзультаце тайнага галасавання новы склад парткома значна абнавіўся. Упершыню выбраны ў партком тт. Землякоў — інструктар парткома, Корэнеў — начальнік васстановіцельнага поезда, Каханоўская — зам. рэдактара газеты «За социялістычны транспарт», Ліберман — сакратар вузлавога камітэта комсамола, Арлоўскі—былы слесар, нядаўна выбраны сакратаром парткома вагоннага ўчастка і Пухаў — начальнік пажарнай аховы аддзялення.

З старага склада парткома ў новы партком выбралі тт. Поліцана, — б. сакратара парткома, Мастыка—б. нам. сакратара парткома, Маркелава — начальніка НКВД аддзялення, Сямёнава—нам. нач. палітаддзела аддзялення і Кандрацева — сакратара парткома парвозного дэпо.

З. ЛАРЫСАЎ.

ІНСТРУКТАР РАЙКОМА АСЛАБІЎ КРЫТЫКУ

(Партарганізацыя полацкага леспрамгаса)

Парторг тав. Калпакоў пачаў свой даклад са слоў: «Партарганізацыя леспрамгаса працавала над выкананнем гістарычных рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б)». Пасля гэтых слоў можна было чакаць, што парторг раскажа як партарганізацыя выкрывала ворагаў народа, як ліквідуюцца вынікі шкодніцтва, як выпраўляюцца дапушчаныя памылкі пры выключэнні комуністаў з партыі.

Але ўсё гэта парторг чамусьці абышоў.

У леспрамгасе працуе звыш 500 чалавек. Сярод іх — 120 стаханаўцаў. Ёсць людзі, вядомыя ўсёй краіне, — тт. Туфар, Пугач, выдатныя стаханаўцы тт. Кір'янаў, Лемешаў і іншыя.

Аднак партарганізацыя за справаздачны перыяд не прыняла ў рады партыі ні аднаго чалавека.

Выкананне плана, гаспадарчую дзейнасць леспрамгаса парторг таксама старанна абыходзіў. Між тым, леспрамгас не выканаў план 1937 года, зрывае яго і ў 1938 годзе. Аўтабаза працуе з рук вон дрэнна, тут яшчэ арудуюць ворагі. Нядаўна быў падпалены аўтагараж. Гаворачы аб гэтым ускользь, парторг заключыў: «У нас, па-мойму, ёсць шкодніцтва, але хто шкоднік — я сказаць не магу.

Ці вінават адзін парторг, што даклад атрымаўся павярхоўным, у якім абыйдзены важнейшыя пытанні партыйна-палітычнай работы. Значную долю віны абавязан узяць на сябе райком партыі і інструктар райкома тав. Левін.

Тав. Левін палічыў неабходным выступіць у канцы спрэчак. У сваім выступленні ён падняў рад вострых пытанняў. Пасля яго некаторыя комуністы яшчэ раз жадалі выступіць, але было ўжо позна. Сход рашыў спыніць спрэчкі. Напрашваецца пытанне: чаму інструктар райкома не выступіў значна раней, каб даць правільны напрамак у рабоце сходу, садзейнічаць разгортванню большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі?

Зусім правільна ў сваіх выступленнях крытыкавалі райком за адсутнасць канкрэтнага кіраўніцтва партарганізацыяй. Ні разу сакратары райкома не былі ў леспрамгасе, ні разу не выклікалі ў райком парторга.

Тав. Ровін крытыкаваў райком за заняжку з выдачай яму партбілета, які чакальмі дзён таму назад прыслан у райком, але там не знойдуць часу, каб аформіць яго і выдаць Ровіну.

Многія комуністы ў сваіх выступленнях расказвалі аб фармальна-бюракратычных адносінах райкома партыі да выканання рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б).

Тайным галасаваннем парторгам выбран тав. Савінскі.

В. ЗЕЛЬМАНАЎ.

ПАРУШАЮЦЬ ІНСТРУКЦЫЮ ЦК ВКП(б) АБ ВЫБАРАХ

МАГІЛЕЎ. **(Спец. кар.).** У Магілеўскай гарадской партыйнай арганізацыі яўна недаацэньваюць афармленне партыйных дакументаў справаздачна-выбарчых сходаў (справаздачы, пратаколы і т. д.). Нават маюць месца выпадкі парушэння інструкцыі ЦК ВКП(б) аб выбарах кіруючых парторганаў.

Так, напрыклад, у гарком партыі былі зданы ў адкрытым відзе спісы кандыдатур тайнага галасавання раду партыйных арганізацый (мэблевая фабрыка, рымарная, цукеркавая і інш.). Гэтыя спісы захоўваюцца там і зараз разам з пратаколамі. А як вядома, згодна інструкцыі ЦК ВКП(б), спісы галасавання павінны захоўвацца ў пярвічнай партыйнай арганізацыі на правах сакрэтных дакументаў.

Выключна неахайна пішуцца пратаколы сходаў і афармляюцца пастановы.

Буйным недахопам з'яўляецца і тое, што з 42 арганізацый, у якіх прайшлі справаздачна-выбарчыя сходы, толькі 19 афармілі дакументы і прадставілі іх у гарком.

С. ЛЯСНЕУСКІ.

РАБОТА ПАРТКОМА ПРЫЗНАНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ

Справаздачна-выбарчы партыйны сход на менскай швейнай фабрыцы «Кастрычнік»

З 132 членаў і кандыдатаў партыі, якія прысутнічалі на справаздачна-выбарчым сходзе, выказаліся 42 чалавекі. Не быў упушчан ні адзін участак партыйнай работы і гаспадарчага жыцця. Спрэчкі паказалі значны ідэйны рост партыйнага калектыва фабрыкі.

Пытанні павышэння пільнасці і ліквідацыі вынікаў шкодніцтва занялі шмат месца пры абмеркаванні справаздачы парткома. Вядома, што доўгі час на чале парткома і кіраўніцтва фабрыкі стаялі ворагі народа. І зусім законна комуністы хацелі пачуць ад сакратара парткома т. Меламеда, як ліквідуюцца вынікі шкодніцтва на фабрыцы, як партыйная арганізацыя і кожны комуніст у паасобку мабілізаваны на павышэнне большэвіцкай пільнасці. Аб гэтым дакладчык сказаў вельмі мала. Між тым, як выяснілася з выступленняў тт. Вайсмана, Гінзбурга, Левіна і раду іншых, варожае ахвосце на фабрыцы прадаўжае сваю шкодніцкую работу. У трэцім цэху на працягу доўгага часу ляжаць 800 гатовых паліто, якія з'ядаюцца пацукамі. Толькі днямі ў другім цэху меў месца шкодніцкі акт — парэзана 5 паліто. Ёсць сігналы аб шкодніцкай рабоце на будаўніцтве новага корпуса фабрыкі.

Законнае незадаволенне выклікала ў комуністаў і тое, што дакладчык абышоў маўчаннем важнейшае пытанне аб ходзе рэалізацыі рашэння студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б). Рад таварышаў з фабрычнага калектыва былі выключаны з партыі па паклёпніцкіх матэрыялах. Пасля Пленума 5 чалавек адноўлены ў радах партыі. Але партком нават не інфармаваў аб гэтым партыйную арганізацыю, адноўленыя таварышы не прыцягнуты да партыйнай і грамадскай работы.

Сур'ёзная ўвага ў спрэчках была звернута на рост партыі, пастаноўку масава-выхаваўчай работы, работу са спачуваючымі. А гэта работа была пастаўлена асабліва дрэнна. Група спачуваючых з 80 чалавек, замест росту, зменшылася да 68 чал. Між тым, рабочы калектыў фабрыкі налічвае 2.500 чалавек, сярод якіх значная колькасць старых рабочых. Партыйная арганізацыя вырасла за лік спачуваючых толькі на 9 чалавек.

Такое становішча тлумачыцца тым, што партком і парторгі пэхаў фармальна адносіліся да важнейшай работы з рэзервам партыі, ігнаравалі ўказанні партыі аб рабоце са спачуваючымі. 40 спачуваючых не прымаюць удзелу ў грамадскай рабоце, не маюць ніякіх партыйных даручэнняў. Старая работніца фабрыкі т. Палешчук уступіла ў групу спачуваючых 4 годы таму назад, яна нідзе не вучыцца, ніякіх даручэнняў не мае, яна заяўляе, што партком яе ўжо не лічыць у групе спачуваючых. Спачуваючы тав. Шостак прасіў прымацаваць да яго таварыша, які-б дапамог яму вучыцца, але ніхто на гэта не звярнуў увагі. Пераведзеная ў час чысткі партыі з кандыдатаў у спачуваючыя работніца тав. Сеўчук мае 4-х дзяцей, не магла рэгулярна наведваць заняткі гуртка, але партком ёй не аказвае індывідуальнай дапамогі ў вучобе. У цэху, дзе парторгам з'яўляецца тав. Фрэйнклах, налічваецца 20 спачуваючых, іх ні разу не склікалі, не гутарылі з імі.

Другое сур'ёзнае пытанне, якое было ўзнята ў спрэчках, — гэта работа сярод комуністак-мацярэй. Гэта пытанне мае асабліва актуальнае значэнне. 69 чалавек — амаль 50 проц. партыйнай арганізацыі — жанчыны, з іх 28 мацярэй, у якіх ёсць малыя дзеці. Гэта група комуністаў патрабуе дыферэнцыяванага падыходу па ўсіх пытаннях работы і вучобы.

Старая работніца, актыўны член партыі з 1929 года, тав. Чарная ўжо на працягу года не працуе. Такое-ж становішча і з комуністкамі тт. Дворкінай, Мішэль і іншымі, якія адрываюцца ад партыйнага жыцця.

Пытанне бытавога абслугоўвання работніц у цэлым павінна было-б заняць значна больш месца ў рабоце парткома. Фабрыка перайшла на работу ў тры змены. Комуністы зусім правільна крытыкавалі партком за дрэннае абслугоўванне вячэрняй і начной змен. Няправільна расстаўлены комуністы па зменах. У трэцяй змене няма ні аднаго члена партыі, які працаваў-бы ля станка.

Партыйная арганізацыя і яе партком патрабавалі за справаздачны перыяд асабліва сур'ёзнай дапамогі з боку Кагановіцкага горрайкома КП(б)Б і Менскага гаркома, але гэта дапамога не была аказана. Большасць выступаўшых таварышаў рэзка і правільна крытыкавала горрайком і гарком.

— За ўвесь час, — гаварылі тт. Альперовіч, Монін, Брэгман і інш., — не бачылі мы на фабрыцы нікога з Менскага гаркома. Сакратара гаркома КП(б)Б тав. Матвеева не ведаюць нават парторгі.

На працягу 4 гадзін абмяркоўвалі комуністы рэзалюцыю па справаздачы парткома. Сход падкрэсліў некаторы зрух у рабоце парткома за 1938 год, але ў цэлым работа парткома за справаздачны перыяд прызнана нездавальняючай.

Тайным галасаваннем у склад парткома выбрана 9 чалавек — тт. Шышко — рабочы, Зялёнка — работніца, Левін — рабочы, Шадсон — рабочы, Меламед — былы сакратар парткома, Ганчароў — інструктар райкома КП(б)Б, Каганоў—дырэктар фабрыкі, Гофштэйн — тэхнічны дырэктар, Фрыд — старшыня фабкома.

На справаздачна-выбарчым сходзе партыйнай арганізацыі бабруйскага Лесакамбіната. Фото Я. Салавейчыка.

ФАШЫСЦКАЯ ПАГРОЗА ЧЭХАСЛАВАКІІ

І. АЛАЎ

—о—

Як вядома, прыход Гітлера да ўлады яшчэ больш абвастрыў існуючыя супярэчнасці ў Еўропе і, у прыватнасці, у Дунайскім басейне. Фашысцкая Германія, якая ўзброілася яваным парадкам, адразу ўстала на шлях агрэсіўных дзеянняў і правакацый вайны ў Еўропе. Рыхтуючыся да «вялікай вайны» за перадзел свету, германскі фашызм імкнецца стварыць у Дунайскім басейне і ў Балканскіх краінах ваенны, палітычны і эканамічны плацдарм для ўстанаўлення сваёй гегемоніі ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе.

Фашысцкія агрэсары даўно ўжо абвяшчалі, што малыя краіны не маюць права на самастойнае дзяржаўнае існаванне. Германская акупацыя Аўстрыі — грознае папярэджанне для ўсіх малых краін і народаў. Зараз захватнікі імкненні германскага фашызма накіраваны на Чэхаславакію. Для гітлераўскай Германіі Чэхаславакія—надзвычай ласы аб'ект. Яна мае багатыя карысныя выкапні—вугаль, жалезную руду, золата, серабро, марганец, вальфрам, радый і т. д.; валодае значнымі сыравіннымі сельскагаспадарчымі рэсурсамі. Яе прамысловыя цэнтры з'яўляюцца буйнейшымі цэнтрамі індустрыі ў Заходняй Еўропе. Па здабычы каменнага вугалю Чэхаславакія стаіць на ўзроўні перадавых капіталістычных краін Еўропы. Машынабудаўнічая прамысловасць Чэхіі карыстаецца сусветнай рэпутацыяй.

Чэхаславакія атрымала ў спадчыну 75 процантаў усёй прамысловасці былой Аўстра-Венгрыі, у тым ліку каля 2/3 металаапрацоўчай прамысловасці. Яна з'яўляецца прамысловай дзяржавай з магутным вытворчым апаратам. З усёй валавой прадукцыі краіны 80 проц. падае на прамысловасць і толькі 20 проц. на сельскую гаспадарку.

Па асноўных эканамічных паказальніках Чэхаславакія стаіць наперадзе раду еўрапейскіх краін. У 1936 годзе ў краіне было здабыта 12.232 тыс. тон каменнага вугалю, выраблена 1.140 тыс. тон чыгуну і 1.560 тыс. тон сталі. Цэнтрамі металургічнай прамысловасці з'яўляюцца гарады Прага, Пільзень, Мараўска Острава, Брно, Браціслава. Машынабудаўнічая прамысловасць вырабляе ў вялікай колькасці лакаматывы, вагоны, паравыя машыны і турбіны, рухавікі ўнутранага згарання і т. д. За апошнія годы вельмі вырасла прадукцыйнасць чэхаславацкай аўтамабільнай прамысловасці. Восем аўтазаводаў у стане выпускаць 40.000 аўтамабіляў у год. Апрача таго, краіна мае значную хімічную прамысловасць.

Чэхаславакія, як незалежная дзяржава, узнікла пасля вайны. Яе граніцы вызначаны пасляваеннымі Сен-Жэрменскім і Трыанонскім дагаворамі. Да вайны тэрыторыя сучаснай чэхаславацкай дзяржавы была асноўнай часткай Аўстра-Венгерскай імперыі Габсбургаў.

Тэрыторыя сучаснай Чэхаславацкай рэспублікі роўна 140.394 кв. кілометрам, на якіх пражывае 15,2 мільёна чалавек. Найбольшая шчыльнасць насельніцтва ў Чэхіі, Маравіі і Сілезіі. У Славакіі, і ў асаблівасці ў Падкарпацкай Русі, яна значна ніжэй.

Па нацыянальнаму складу насельніцтва Чэхаславакіі падзяляецца наступным чынам (у процантах да агульнай колькасці насельніцтва): чэхаў — 49,3 проц., славакаў — 16,2 проц., немцаў — 23,4 проц., венграў — 5,6 проц., украінцаў — 3,4 проц., яўрэяў — 1,3 проц., палякаў — 0,6 проц., іншых — 0,2 проц. Асноўная маса нямецкага насельніцтва Чэхаславакіі жыве ў прылягаючай да граніцы з Германіяй Судэцкай вобласці.

Гвалтоўнае далучэнне Аўстрыі да «Трэцяй імперыі» і акупацыя яе германскімі войскамі з'яўляецца прэлюдыяй далейшых германскіх захватаў у Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропе. Непасрэдная небяспека пагражае зараз Чэхаславацкай рэспубліцы, граніцы якой з Германіяй пасля акупацыі Аўстрыі падоўжыліся ў паўтара раза. Агульная працяжнасць граніц Чэхаславакіі складае 3.000 кілометраў. Працяжнасць германа-чэхаславацкай граніцы складала раней 900 кілометраў, а цяпер, пасля захвату фашысцкай Германіяй Аўстрыі, — 1.400 кілометраў. Значную частку гэтай пагранічнай тэрыторыі займае так званая вобласць Судэцкіх немцаў, якая з'яўляецца асноўнай базай падрыўной дзейнасці германскай агентуры ў Чэхаславакіі — фашысцкай партыі Генлейна.



Аднак, было-б грубейшай памылкай думаць, што Чэхаславакія можа з такой-жа лёгкасцю папасці ў рукі Гітлера, як Аўстрыя.

Чэхаславацкая рэспубліка валодае моцнай і боездольнай арміяй, колькасць якой можа быць даведзена ў ваенны час да 1.500.000 чалавек. Чэхаславацкая армія, пры наяўнасці высока-раэвітай прамысловасці, багата аснашчана перадавой ваеннай тэхнікай. Нарэшце, Чэхаславакія, удзельнічаючы ў сістэме калектыўнай бяспекі і маючы саюзны дагавор з Францыяй, а таксама пакт узаемнай дапамогі з СССР, не знаходзіцца ў адзіноцтве на міжнароднай арэне, падобна Аўстрыі. Але ўсё-ж небяспека германскага нападу на Чэхаславакію вельмі вялікая.

Напад Германіі на Чэхаславакію мыслімы, зразумела, толькі ў тым выпадку, калі германскі агрэсар будзе ўпэўнен, што дзяржавы не падтрымаюць Чэхаславакію. Зусім ясна, што ў першую чаргу гэта залежыць ад пазіцыі Францыі і Англіі. Францыя ўжо заявіла аб гатоўнасці выканаць свае абавязацельствы перад Чэхаславакіяй па дагавору аб узаемнай дапамозе. Што датычыць Англіі, то з боку брытанскіх рэакцыянэраў, якія групуюцца вакол Чэмберлена, наглядаецца пэўны дыпламатычны націск на Чэхаславакію, мэта якога прымусіць яе пайсці на ўступкі гітлераўскаму агенту Генлейну і прадаставіць Судэцкай вобласці аўтаномію. Задаволенне гэтага патрабавання Генлейна азначала-б раздзел Чэхаславацкай рэспублікі. Пазіцыя, занятая Чэмберленам і яго аднадумцамі, у адносінах бязапаснасці Чэхаславацкай рэспублікі не толькі аблягчае фашысцкім падпальшчыкам вайны напад на Чэхаславакію, але і б'е па французскіх пазіцыях у Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропе.

У сучасны момант германскія фашысты, акупіраваўшы Аўстрыю, стараюцца «асвоіць» новыя граніцы з Чэхаславакіяй. Па меры акружэння Чэхаславакіі ваенным кальцом дзейнасць судэта-нямецкай партыі Генлейна — гітлераўскай агентуры ў краіне — прымае ўсё больш наглы і правакацыйны характар. Створаныя ў Судэцкай вобласці тайныя штурмавыя атрады генлейнаўцаў прыводзяцца ў баявую гатоўнасць. Атрады разбіты на «дзесяткі», на чале якіх стаяць спецыяльныя інструктары, прайшоўшыя ваенную падрыхтоўку ў Германіі. Гітлераўскія агенты нагла заяўляюць, што з акупацыяй Аўстрыі наблізіўся «час вялікіх рашэнняў» і для Чэхаславакіі.

Унутрыпалітычнае становішча Чэхаславакіі ўскладнілася яшчэ тым, што гэтай падрыўной рабоце гітлераўскай агентуры дапамагаюць рэакцыйна-фашысцкія элементы краіны. Самая буйная ўрадавая партыя — партыя аграрыяў — не толькі патрабуе стварэння ў Чэхаславакіі рэакцыйна-фашысцкага ўрада, але і настойвае на прыцягненні ў чэхаславацкі ўрад Генлейна. Увядзенне ва ўрад прамога гітлераўскага агента Генлейна па сутнасці паўтарыла-б вопыт з увядзеннем у аўстрыйскі ўрад Зейс-Інкварта. Гэтым самым аграрыі пробуюць дабіцца капітуляцыі Чэхаславацкай рэспублікі перад фашысцкай Германіяй. Пры гэтым аграрыі дабіваюцца скасавання саюзнага дагавору з Францыяй і пакта ўзаемнай дапамогі з СССР. Вядома, што планы Гітлера прадугледжваюць задачу адарваць Чэхаславакію ад яе саюзнікаў і ізаляваць яе на міжнароднай арэне.

Такая палітыка аграрыяў, несумненна, уплывае на актывізацыю ў краіне ўсіх рэакцыйных фашысцкіх элементаў. Рэзультатам інтрыг аграрыяў з'явіўся таксама выхад з уладаў кааліцыі прадстаўнікоў нямецкіх партый, якія ўвайшлі ў фашысцкую партыю Генлейна. Апрача, таго, гэта падбадзёрыла ўсе шавіністычныя элементы краіны ў іх выступленнях у палаце дэпутатаў з патрабаваннем аўтаноміі для раду абласцей Чэхаславацкай дзяржавы. Чэшскія аграрыі ў асобе свайго старшыні Рудольфа Беран вядуць тайныя перагаворы з германскім пасланнікам у Празе — Эйзенлорам. Аграрыі прабуюць падрыхтаваць запродаж чэхаславацкай дзяржавы гітлераўскай Германіі.

Урокі фашысцкага захвату Аўстрыі настойліва ставяць перад усімі сапраўднымі прыяцелямі міру задачу — дабіцца яснай і недвухсэнснай пазіцыі кіруючых еўрапейскіх дзяржаў у адносінах захавання незалежнасці і недатыкальнасці Чэхаславакіі, а таксама — падтрымаць чэхаславацкі народ у яго барацьбе супроць фашысцкай пагрозы рэспублікі.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ Ў ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР

МАСАВАЯ РАБОТА ЗАБЯСПЕЧЫЛА ВЫТВОРЧЫЯ ПЕРАМОГІ

Добра наладжаная масава-агітацыйная работа на гомельскім камбінаце імя Ежова забяспечыла рэзкае паляпшэнне вытворчай работы. Калі да верасня камбінат сістэматычна не выконваў план, то пасля арганізацыі сістэматычнай масавай работы ў цэхах, у сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўны Совет СССР, рэзка ўзнялося выкананне плана. Ужо ў кастрычніку камбінат даў 101,6 проц. плана, у лістападзе — 103,2 проц., а ў снежні рабочы калектыў атрымаў новую перамогу — выканаў план на 121,3 проц.

Камбінат працягвае перавыконваць свой план і ў 1938 годзе. Так, у студзені ён выканаў план на 112,2 проц., у лютым — на 108,3 проц., за 28 дзён сакавіка — на 109,3 проц.

Пасля выбараў у Вярхоўны Совет СССР агітацыйна-масавая работа як у цэхах, так і на прымацаваным былым выбарчым участку не спынялася. Па цэхах праводзяцца восем разоў у месяц гутаркі аб Канстытуцыі БССР, «Палажэнні аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», а таксама па пытаннях бягучай палітыкі. На прымацаваным былым выбарчым участку ў 42 гуртках, якія яхапляюць каля 500 хатніх гаспадынь (з агульнай колькасці 1.400 выбаршчыкаў) заняткі праводзяцца адзін-два разы ў пяцідзённку.

Апрача работы ў гуртках штомесяц праводзяцца два-тры агульныя сходы выбаршчыкаў былога выбарчага ўчастка, на якіх заслухваюцца даклады і лекцыі аб міжнародным становішчы, аб падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР і інш.

Рад агітатараў паказалі ўзоры вельмі добрай пастаноўкі заняткаў у гуртках. Многія з іх скарыстоўвалі газеты з найбольш цікавымі матэрыяламі і мастацкую літаратуру.

Агітатар тав. Севасцянаў, напрыклад, праводзячы гутарку аб 20-й гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, чытаў урыўкі з апавядання А. Талстога «Хлеб». Агітатар тав. Еўраёў у гутарцы аб працэсе над «права-трацкісцкім блокам» чытаў урыўкі з кнігі Первенцова «Качубей» і вельмі ўдала асвятліў здрадніцкі твар іуды Троцкага. Агітатар тав. Окунь чытаў слухачам свайго гуртка расказы са зборніка «Жанчына ў грамадзянскай вайне». Гэта так спадабалася слухачам гуртка, што многія з іх бралі гэтую кнігу ў бібліятэцы, каб яе прачытаць. Падобных прыкладаў можна было-б прывесці значна больш.

Для выбаршчыкаў нашага былога выбарчага ўчастка дэманстравалі кінокарціны: «Ленін у Кастрычніку», «На Далёкім Усходзе», «За Совецкую радзіму», «Балтыйцы», «Падругі», «Пётр І», «Доч радзімы», «Шукальнікі шчасця», «Пугачоў», «Дуброўскі», «Шахцёры» і інш.

Для агітацыйна-масавай рботы сярод выбаршчыкаў, партарганізацыяй вылучана дадаткова 47 агітатараў. Такім чынам, усяго будзе больш 100 агітатараў. Упершыню вылучана на агітацыйную работу 16 чалавек. Да іх прымацаваны агітатары, якія маюць вялікі вопыт практычнай работы. Апрача таго парткабінет аказвае гэтым таварышам штодзённую дапамогу, наладжваючы кансультацыі і забяспечваючы іх поўнасцю неабходнай літаратурай.

Парткабінет правёў дзве нарады агітатараў для абмену вопытам. На спецыяльным партыйным сходзе былі таксама заслуханы справаздачы некалькіх агітатараў аб іх рабоце.

Мы практыкуем і перыядычнае склікание агітатараў сумесна са старастамі гурткоў, дзе выяўляем недахопы ў рабоце асобных гурткоў і дзелімся станоўчым вопытам.

Лепшыя агітатары прыняты ў кандыдаты партыі і ў спачуваючыя. У кандыдаты партыі, напрыклад, прыняты тт. Камароў, Дзяткоў, Гладкоў, Сорокалетаў, Прыходкіна, Лемперт і інш. 14 чалавек прынята ў групу спачуваючых. На кіруючую, гаспадарчую і культурную работу вылучана 11 агітатараў.

Група лепшых агітатараў нашага камбіната наведала нядаўна шклозавод, дзе агітацыйна-масавая работа пастаўлена незадавальняюча. Таварышы расказалі, якімі метадамі яны наладзілі работу гурткоў, як яны дабіваюцца, каб заняткі былі цікавымі.

Калектыў агітатараў камбіната імя Ежова прасякнут імкненнем яшчэ лепш паставіць агітацыйна-масавую работу, дастойна сустрэць міжнароднае свята Першае мая і выбары ў Вярхоўны Совет БССР.

Б. КАПАРОЎСКІ,
загадчык парткабінетам Гомельскага камбіната імя Ежова.

НАЛАДЗІЛІ РАБОТУ ПА ДЗЕСЯЦІДВОРКАХ

ПЛЕШЧАНІЦЫ. Партарганізацыя Завішчанскага сельсовета на адкрытым сходзе намеціла канкрэтны план арганізацыі палітмасавай работы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Мы правялі па калгасах сходы, прысвечаныя падрыхтоўцы да выбарчай кампаніі, і чатыры інструкцыйныя нарады агітатараў і бяседчыкаў. У перадвыбарчую работу ўключыўся ўвесь партыйна-камсамольскі актыў, настаўнікі і калгаснікі. Ужо арганізавана 14 гурткоў, якія пачалі рэгулярна працаваць і ахапілі вучобай 819 чалавек, у тым ліку 403 жанчыны.

У калгасе «14-годдзе Кастрычніка» кіраўнік гуртка Аляксандр Брэцкі правёў ужо 3 заняткі. Гурток працуе жыва і цікава. Агітатар Андрэй Мядзведзеў з калгаса «Парыжская Комуна» не абмяжоўваецца толькі вывучэннем з калгаснікамі Канстытуцыі БССР і выбарчага закона, ён расказвае ім аб міжнародным становішчы. Калгаснікі з ахвотай наведваюць гурток. Добра працуюць і агітатары Аляксандр Глявіцкі, Міхаіл Мазоўка, Марыя Салаўёва, Іван Копаць.

Апрача гурткоўай работы вылучалы 32 агітатары для растлумачэння Канстытуцыі БССР і выбарчага закона па дзесяцідворках, сярод хатніх гаспадынь і аднаасобнікаў. Прапагандыст тав. Баброў праводзіць гутаркі з калгаснікамі на-даму. Мы прыцягваем па агітацыйнай работы радавых калгаснікаў і калгасніц, якія спалучаюць агітацыйную работу з ударнай працай у калгасе. Калгасніца Франя Шакола (калгас імя СНК БССР) паказала ўзоры большэвіцкай агітацыі ў часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Зараз яна ўзорна паставіла палітычна-растлумачальную работу сярод жанчын сваёй дзесяцідворкі. Звеннявая тав. Шакола абавязалася дабіцца ўраджаю 6 цэнтнераў ільнавалакна з гектара.

Ва ўсёй правядзімай агітацыйна-масавай рабоце партарганізацыя сельсовета скарыстоўвае вопыт, накоплены ў часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

ВАСІЛЬ ШАБАН,
старшыня Завішчанскага сельсовета.

У ГУРТКУ ХАТНІХ ГАСПАДЫНЬ

Вечарэе. Калгаснікі калгаса імя Молатава. Выгрэбна-Слабодскага сельсовета, Брагінскага раёна, збіраюцца на заняткі гурткоў па вывучэнню Канстытуцыі БССР і выбарчага закона.

Вось асобны гурток хатніх гаспадынь. Сабраліся яшчэ не ўсе. Гэтым часам прышоўшыя калгаснікі ўважліва слухаюць патэфон. Калі ўжо ўсе на месцы, прапагандыст пачынае заняткі. У памяшканні цішыня. Усе ўважліва слухаюць кожнае слова агітатара. Пасля растлумачэння прапагандыстам асобных артыкулаў палажэння аб выбарах, слухачы задаюць пытанні, на якія атрымліваюць вычарпальныя адказы.

Калі заняткі заканчваюцца, найбольш старыя жанчыны расказваюць аб «выбарах» пры царскай уладзе.

Толькі познім вечарам калгасніцы разыходзяцца дамоў. **Г. СІКОРЫН.**

***

РАГАЧОЎ. Студэнты Рагачоўскага педвучылішча актыўна вывучаюць на палітзаняткох Канстытуцыю і «Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР».

Прапагандыстамі працуюць лепшыя комсамольцы.

Студэнты ахвотна і акуратна наведваюць заняткі. **М. КАЗЛОЎСКІ.**

СУСТРЭЧА КУРСАНТАЎ МЕНСКАГА ВАЕННАГА ВУЧЫЛІШЧА З ВУЧНЯМІ І СТУДЭНТАМІ

600 вучняў старшых класаў школ Менска і студэнты вышэйшых навучальных устаноў прышлі 18 красавіка ў Дом Чырвонай Арміі. Іх сустракалі будучыя лейтэнанты Чырвонай Арміі — курсанты Менскага ваеннага вучылішча. У абшырных гасціных, карыдорах і залах ДЧА курсанты з захапленнем расказвалі аб сваіх выдатных буднях, аб тым, як з іх выхоўваюць камандзіраў Чырвонай Арміі.

У перапоўненай канцэртнай зале адбыўся сход удзельнікаў гэтай цікавай сустрэчы. Начальнік вучылішча — палкоўнік Цузікаў—расказаў аб тым, як многа ўвагі аддаюць партыя і ўрад камплектаванню ваенных вучылішч выдатнымі кадрамі, якімі клопатамі акружаюцца будучыя баявыя камандзіры адважных артылерыстаў, пехацінцаў, кавалерыстаў, танкістаў і лётчыкаў.

З цёплай, змястоўнай прамовай выступіў курсант вучылішча тав. Луфераў. Ён — выдатнік вучобы, за высокія паказчыкі ў баявой падрыхтоўцы занесен на дошку гонару БВА. Тав. Луфераў расказаў аб тым, як многа дало яму ваеннае вучылішча, як непазнавальна вырас ён у культурных адносінах.

Следам за Луферавым выступілі будучыя курсанты ваенных вучылішч — зараз студэнты вышэйшых навучальных устаноў — тт. Дашкоўскі і Іофе.

Яны расказалі аб тым энтузіязме, з якім сустрэла совецкая моладзь пачатак прыёму заяў у ваенныя вучылішчы, аб вялікім імкненні маладых совецкіх патрыётаў паступіць у ваенныя вучылішчы.

Выступленне сакратара гаркома ЛКСМБ тав. Рапапорта было гарачым заклікам да моладзі Менска — ісці ў ваенныя вучылішчы, выбраць пажыццёвай прафесіяй службу ў Чырвонай Арміі на пасту камандзіра.

Скончылася гэта сустрэча паказам выдатнага самадзейнага мастацтва курсантаў і камандзіраў вучылішча. Удзельнікі сустрэчы, слухаючы яркія, запамінаючыяся выступленні, яшчэ раз пераканаліся ў тым, як цікава арганізоўваюць свой вольны час курсанты вучылішча, у напружанай вучобе не забываючы аб вясёлай частушцы, танцах і бадзёрай песні.

ВЕЛІЗАРНЫ ПОПЫТ НА ВЫБАРЧУЮ ЛІТАРАТУРУ

Працоўныя БССР прад'яўляюць велізарныя патрабаванні на выбарчую літаратуру. Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі ўжо выпусціла 13 назваў выбарчай літаратуры на беларускай, рускай і яўрэйскай мовах, агульным тыражом каля 2 мільёнаў экземпляраў. У ліку вышэйшых з друку кніг і брашур — «Тэзісы і даклад аб буржуазнай дэмакратыі і дыктатуры пролетарыята» — В. І. Леніна, яго-ж — «Выбары ва ўстаноўчы сход і дыктатура пролетарыята», Прамова таварыша Сталіна на сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі Масквы, Пісьмо таварыша Іванова і адказ таварыша Сталіна і інш.

Мільённы тыраж «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» і 350-тысячны тыраж Канстытуцыі БССР поўнасцю разышліся. У сувязі з усё павялічваючымся попытам дадаткова друкуюцца яшчэ 300 тысяч экземпляраў Канстытуцыі БССР і 500 тысяч экземпляраў выбарчага закона.

Да выбараў у Вярхоўны Совет БССР выдаецца яшчэ 14 назваў выбарчай літаратуры. Выпускаецца даклад таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі СССР на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў». «Улада Советаў пераможа» — Леніна, «Самыя дэмакратычныя выбары ў СССР» — Вышынскага, «Комунізм і рэлігія» — Яраслаўскага і інш.

ДОБРАБЫТ МЯСТЭЧКА ЧАШНІКІ

ЧАШНІКІ. У гэтым годзе ў мястэчку Чашнікі праводзіцца рад мерапрыемстваў па ўпарадкаванню вуліц. Мястэчка азеляняецца. Па Совецкай вуліцы пасаджана ўжо 86 дрэў. Да Першага мая будуць азеленены Ленінская, Луначарская і Пролетарская вуліцы. Асфальтуюцца 3 тысячы квадратных метраў маставых.

ВОДГУКІ НА АНГЛА-ІТАЛЬЯНСКАЕ ПАГАДНЕННЕ

ЛОНДАН, 18 красавіка. (БЕЛТА). Апазіцыйны друк рэзка выступае супроць англа-італьянскага пагаднення. Ліберальная газета «Ньюс кронікл» піша, што гэта пагадненне з'яўляецца здзелкай паміж двума імперыялістычнымі дзяржавамі. У рэзультаце гэтай здзелкі Італіі даруецца разбой, які яна рабіла і робіць супроць Абісініі і Іспаніі. Мусаліні, прадаўжае газета, маючы ў адной кішэні «вось Рым—Берлін», а ў другой—англа-італьянскае пагадненне, будзе мець магчымасць прадаўжаць сваю палітыку шантажа.

Газета «Дэйлі геральд» піша, што Мусаліні можа быць задаволен сваімі поспехамі, бо «Англія згадзілася пайсці на мір з Італіяй на ўмовах, якія былі ёй прадыктаваны».

Дыпламатычны агляльнік газеты «Дэйлі геральд» піша: «Англія не прадпрыме нічога, што нанесла-б страты мяцежнікам або затрудніла італьянскую інтэрвенцыю. Таксама Англія пастараецца ўтрымаць Францыю ад прыняцця якіх-бы там ні было мер у карысць рэспубліканскай Іспаніі».

Ліберальная газета «Манчэстэр гардыян» указвае, што англа-італьянскае пагадненне з'яўляецца ўніжэннем для Брытанскай імперыі. Прэм'ер Чэмберлен у імя дасягнення англа-італьянскага пагаднення афтраваў Іспаніяй і Абісініяй.

***

ПАРЫЖ, 18 красавіка. (БЕЛТА). Каментарыі французскага друку аб англа-італьянскім пагадненні вельмі супярэчлівыя. Правыя газеты і частка радыкал-сацыялісцкіх газет адабраюць падпісанне пагаднення, настойліва заяўляючы, што і Францыя як мас[illegible] хутчэй павінна паследваць англійскам[illegible] прыкладу.

Рэзкую крытыку англа-італьянска[illegible] пагадненне сустракае з боку рабочага друку.

«Юманітэ» піша, што англа-італьянскі дагавор з'яўляецца прэміяй агрэсару. «Падпісаны Англіяй дакумент, — указвае «Юманітэ»,—узаконьвае італьянскую інтэрвенцыю ў Іспаніі».

Указваючы, што з падпісання англа-італьянскага пагаднення французскі палітычныя дзеячы робяць вывад а[illegible] неабходнасці ў сваю чаргу дагавор[illegible] рыцца з Італіяй, «Юманітэ» піша «нельга весці перагаворы з агрэсарам, які з дапамогай сілы ўварваўся на т[illegible] рыторыю краіны, прыязнай Францыі, мае намер блакіраваць нашу граніц[illegible] нельга весці перагаворы з тым, х[illegible] імкнецца абгрунтавацца на нашы шляхах зносін, хто з'яўляецца натхн[illegible] целем хваляванняў у Тунісе».

***

ЛОНДАН, 18 красавіка. (БЕЛТА). Лідэр парламенткай фракцыі лейбарыцкай партыі Этлі выступіў учора [illegible] Перце (Шатландыя) з прамовай, у яко[illegible] заявіў, што Чэмберлен зрабіў вельмі дрэнную здзелку, пайшоўшы на заклю[illegible] чэнне англа-італьянскага пагаднення. «Гэта пагадненне з'яўляецца моцны[illegible] ударам для дэмакратычных сіл усяго свету і будзе спрыяць узмацненню а[illegible] рэсараў. Апрача таго, яно значна а[illegible] лабіць пазіцыю Англіі». Заключана[illegible] англа-італьянскае пагадненне, дада[illegible] Этлі, з'яўляецца не зброяй міру, а м[illegible] неўрам перад новай вайной.

ПА ШЛЯХУ ЗГОВАРУ З АГРЭСАРАМІ

ПАРЫЖ, 18 красавіка. (БЕЛТА). Згодна паведамлення агенцтва Гавас з Лондана, англійскі прэм'ер Невіль Чэмберлен мае намер на прапягу месяца адкрыць перагаворы з Германіяй. Мяркуюць, што, калі не ўдасца заключыць англа-германскага пагаднення накшталт англа-італьянскага, англійскі прэм'ер паспрабуе хоць-бы палепшыць англа-германскія адносіны. Аднак, прадаўжае агенцтва, рад членаў англійскага кабінета выступае супроць гэтых намераў Чэмберлена, лічачы, што пры цяперашніх умовах немагчыма дасягнуць згоды з Германіяй і што любая ўступка ёй або нават просты жэст зроблены ў гэтым напрамку, толь[illegible] заахвоціць Германію да новага в[illegible] ступлення ў Цэнтральнай Еўропе. [illegible] ўсякім выпадку, указвае агенцтва, [illegible] добра інфармаваных колах заяўляю[illegible] што гэта пытанне будзе паднята ў ч[illegible] се наведвання Лондана французск[illegible] дэлегацыяй.

У тых-жа колах, — паведамляе дал[illegible] агенцтва, — указваюць, што Чэмбе[illegible] лен і Галіфакс, мабыць, прапануюць французскай дэлегацыі заключы[illegible] італа-французскае пагадненне на [illegible] шталт англа-італьянскага.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

Па паведамленню іспанскага міністэрства абароны, у сектары на поўнач ад ракі Эбро мяцежнікі 17 красавіка фарсавалі раку Сегрэ ў раёне Камараса (на паўночны ўсход ад Балагера). Аднак, рэспубліканскія войскі адкінулі мяцежнікаў да іх выходных пунктаў і нанеслі ім цяжкія страты.

У сектары на поўдзень ад ракі Эбро войскі мяцежнікаў, падтрыманыя авіяцыяй, прадпрынялі атаку ў раёне на ўсход ад Сан-Матэо (на Міжземнаморскім узбярэжжы). Атака мяцежнікаў была адбіта рэспубліканцамі. У раёне Ульдэкона (на паўночны захад ад [illegible] нароса) ідзе бой.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ

Рэспубліканская авіяцыя падвергла кулямётнаму абстрэлу скапленні войск мяцежнікаў у раёнах Сан Матэо, С[illegible] Хорхе і Вінарос.

Раніцай 17 красавіка самалёты м[illegible] цежнікаў прадпрынялі спробу бамбардзіраваць Барселону, аднак рэспубліканскія зенітныя батарэі прымусілі [illegible] ўцячы.

Зварот іспанскага ўрада да Лігі нацый

ЖЭНЕВА, 19 красавіка. (БЕЛТА). Сакратарыят Лігі нацый атрымаў ад іспанскага ўрада паведамленне, што ён апелірує ў Совет Лігі нацый супроць германа-італьянскай агрэсіі. Зварот [illegible] панскага ўрада будзе ўключан у пар[illegible] дак дня надыходзячай сесіі Совета.

ЗАЯВА АЛЬВАРЭСА ДЭЛЬ ВАЙО

ПАРЫЖ, 18 красавіка. (БЕЛТА). Газета «Эвр» друкуе перададнае па тэлефону з Барселоны інтэрв'ю з іспанскім міністрам замежных спраў Альварэсам дэль Вайо. «Уступленне войск мяцежнікаў на ўзбярэжжа Міжземнага мора, — заявіў Альварэс дэль Вайо,— калі-б яно адбылося два тыдні назад, мела-б значна больш цяжкія вынікі, чым у даны момант. Гэтыя два тыдні дазволілі рэспубліканскаму ўраду пр[illegible] няць усе неабходныя меры, каб заб[illegible] печыць сумесныя дзеянні з астатн[illegible] часткамі рэспубліканскай Іспаніі».

Закрануўшы маральны стан армі[illegible] грамадзянскага насельніцтва, міні[illegible] падкрэсліў, што Барселона, як і аста[illegible] няя Каталонія, поўнасцю мабілізава[illegible] і паказвае ў гэтых адносінах прыкл[illegible] для ўсёй астатняй Іспаніі.

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ СЯЎБЫ

ПЕРШЫЯ ДНІ СЯЎБЫ

Калгасы Рудзенскага раёна пачалі масавую сяўбу яравых культур. Зварот СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб арганізацыі большэвіцкай барацьбы за высокі сталінскі ўраджай і багаты працадзень выклікаў сярод калгаснікаў і калгасніц раёна небывалы вытворчы ўздым. Калгасы «Першае жніўня», «Новы шлях», «Правда» і іншыя ўключыліся ў перадмайскае сацыялістычнае спаборніцтва і абавязаліся сяўбу яравых культур скончыць да Першага мая.

Калгас «Чырвоная Беларусь» засеяў ужо 5 гектараў ільну і 2 гектары ранняй бульбы і падрыхтаваў да пасеву 76 гектараў глебы. Чатыры брыгады калгаса «Перамога» распачалі масавую сяўбу зернавых кандыцыйным і пратручаным насеннем. У калгасе імя Варашылава падрыхтавана да сяўбы 134 гектары глебы і засеяна 4 гектары ільну.

Сярод калгаснікаў шырока разгарнуўся стаханаўскі рух, у выніку чаго многія калгаснікі перавыконваюць нормы па палявых работах у паўтара-два разы. Калгаснікі сельгасарцелі «1 жніўня» тт. Сарока і Залатарэвіч узорваюць за дзень па аднаму гектару замест нормы 0,70 гектара. Тт. Гламбоцкі і Аскабовіч з калгаса «10 год БССР» забараноўваюць у дзень 7 гектараў замест нормы 3 гектары.

Аднак першыя дні сяўбы выявілі пэлы рад недахопаў, дзённую падрыхтаванасць раду калгасаў да сяўбы і факты парушэння агратэхнікі.

Трактары Рудзенскай МТС праз дваТры дні работы пачалі прастойваць, нібы з-за таго, што няма чаго рабіць. На самой-жа справе дырэктар МТС тав. Ганчарык палічыў, што баранаваць заблівае ворыва «нявыгадна» МТС па гэтага часу не заключыла дагаворы са многімі калгасамі на правядзенне палявых работ. **А. АДНАКОЛАЎ.**

СЕЕМ РАДКОВЫМІ СЕЯЛКАМІ

Мне даволі часта прыходзіцца чытаць у газетах, што ў радзе калгасаў нашай рэспублікі прадаўжаюць ігнараваць радковую сяўбу, хаця радковая сяўба намнога павышае ўраджайнасць.

Старшынёй калгаса я працую з 1929 года. І трэба прызнацца, што ў першыя годы калгаснага жыцця вельмі многія калгаснікі былі супроць радковай сяўбы, як і супроць многіх аграмерапрыемстваў. Цяпер калгаснікі добра пераканаліся ў тым, што радковая сяўба намнога павышае ўраджайнасць, і зараз усе яны, як адзін, супроць ручной сяўбы.

Радковую сяўбу мы пачалі прымяняць ужо з 1933 года. Увесь азімы клін на плошчы 185 гектараў у 1937 годзе мы засеялі радковымі сеялкамі. Зараз у нашым калгасе пасеяны радковай сяўбой раннія і зернавыя культуры: аўса — 60 гектараў, ячменю — 30 гектараў, пшаніцы — 20. Толькі 8 гектараў засеяна ўручную па той прычыне, што там немагчыма было сеяць сеялкай. Дзве конныя сеялкі калгаса, замест нормы 3 гектары засявалі па 4 гектары ў дзень.

Азімыя пасевы ў нас таксама прабаранаваны на плошчы 32 гектары. Зроблена падкормка на плошчы 9 гектараў.

Заклікаю ўсіх калгаснікаў і старшынь калгасаў прымяняць радковую сяўбу, што дае магчымасць намнога павысіць ураджайнасць нашых палёў і дабіцца сапраўды культурнага і заможнага жыцця.

Ш. КАРОБКА,
старшыня калгаса «Прагрэс», Нараўлянскага раёна.

ВЫНІК НЕПАДРЫХТАВАНАСЦІ

КЛІЧАЎ. З кожным днём у калгасах раёна шырацца рады стаханаўцаў, якія намнога перавыконваюць нормы апрацоўкі глебы на ворыве, баранаванні і культывацыі. Калгас «Камінтэрн», Несяцкага сельсовета, поўнасцю падрыхтаваў глебу пад яравыя пасевы. Тут узарана звыш 200 гектараў і пачата сяўба ранніх яравых культур.

Аднак, у працэсе масавых палявых работ выяўляецца рад буйнейшых недахопаў у падрыхтоўцы да сяўбы. План абмену радавога насення на сартавое па раёну выканан толькі на 63 проц. Рад калгасаў Владзіміраўскага, Віркаўскага, Усакінскага, Ваевіцкага, Уболацкага, Запольскага і іншых сельсоветаў яшчэ да гэтай пары не абмянялі радавое насенне пшаніцы, ячменю, гароху і аўса на сартавое.

Днямі на базу Заготзярна паступіла 45 тон аўса. Авёс неканд ыцыйны. Яго мяркуюць пусціць на абмен, але пакуль авёс ачысцяць, праверацъ на ўсхожасць, пройдзе нямала часу.

У раёне зараз ёсць тры МТС (дзве новаарганізаваныя). Але трактарны парк вышаў на поле непадрыхтаваным. У калгасе «Шлях социялізма», Усохскага сельсовета, 4 трактары Бацэвіцкай МТС прастаялі 6 дзён, з-за таго, што яны былі вымушчаны з рамонту з дэфектамі.

У калгасе «Пераможац», Ваевіцкага сельсовета, з 1 красавіка працуюць тры трактары. Да 15 красавіка яны ўзаралі толькі каля 40 гектараў, у той час, як павінны былі ўзараць у 3 разы больш.

Дырэктар Бацэвіцкай МТС т. Латышоў, упусціўшы тэрміны рамонту трактараў, «фарсіраваў» рамонт за кошт якасці.

Райзямаддзел, як і раней, нічога не ведае, што робіцца ў калгасах, чакаючы вестак, якіх ніхто не спяшаецца пасылаць. **Я. КРЫСКАВЕЦ.**

ЧАМУ ПРАСТОЙВАЮЦЬ ТРАКТАРЫ

СТАРЫЯ ДАРОГІ. Недапушчальна дрэнна працуе Палажэвіцкая МТС. Вясну яна сустрэла зусім непадрыхтаванай. Гэта МТС атрымала ў бягучую вясну 8 новых выдатных гусенічных трактараў ХТЗ. Але яны злачынна дрэнна скарыстоўваюцца. Больш 10 дзён прастаялі 3 трактары ў калгасах Языльская сельсовета з-за адсутнасці змазачнага матэрыялу і балтоў да плугоў.

У калгасе «Вольны пролетарый» трактар ХТЗ аказаўся зусім няспраўным і ўвесь час не працуе. Аднак, яго не рамантуюць.

У пачатку месяца ў гэты калгас прыбыў новы гусенічны трактар. Але за поўмесяца трактар працаваў толькі 3—4 дні. Прысланыя трактарысты тт. Салавей і Лазука зусім слаба ведаюць трактар, яны нават не ўмеюць заводзіць яго. Тры дні ў калгасе чакалі прыезду старшага механіка Астроўскага. Нарэшце, 12 красавіка ён разам з дырэктарам МТС тав. Мацюхіным прыехаў. За поўгадзіны трактар быў заведзен і пушчан. Але пасля іх ад'езду трактар зноў стаў, не працуе ён і пяпер. 4 красавіка МТС прыслала ў калгас новы культыватар. Але ён ужо без 4-х зубоў. Цяпер з-за таго, што трактар не працуе, культыватар перакінулі ў другі калгас. Па віне МТС глеба не падрыхтавана. За 15 дзён гусенічным трактарам узарана ўсяго 20 гектараў пры норме 12 гектараў у дзень.

ДОБРЫЯ ЎСХОДЫ

СТАРОБІН. У калгасе «Зара Палесся», Даманавіцкага сельсовета, паявіліся першыя ўсходы яравых пасеваў на плошчы 6 гектараў ільну і 12 гектараў аўса. Па заключэнню раённага агранома ўсхожасць пасеваў добрая. **П. ЛОЙКА.**

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

ХАНЬКОЎ. 18 красавіка. (БЕЛТА). Кітайскія войскі ў правінцыі Шаньдун акружылі горад Ісянь, які знаходзіцца ў руках японцаў. На паўночны ўсход ад Ісяня прадаўжаецца накапленне японскіх войск у Цзюйчжоу. Туды перакінута на грузавіках да 4.000 салдат.

У заходняй частцы правінцыі Шаньсі кітайскія войскі правялі некалькі паспяховых аперацый і ачысцілі ад японцаў гаралы — Шылоу, Юнхэ, Данін, Пусянь, Цзісянь, Сянін і Учэн. Па паведамленню кітайскага камандавання, у рэзультаце баёў японцы страцілі ў заходняй частцы Шаньсі не менш трох тысяч салдат забітымі і раненымі.

Партызанскі рух у тылу японцаў прадаўжае расці. Агенцтва Сентрал Ньюс адзначае, што ў паўночнай Хэнані зараз дзейнічае звыш 50 тысяч партызан. Значныя атрады партызан дзейнічаюць у 50 клм. ад Бэйпіна.

***

ЛОНДАН, 18 красавіка. (БЕЛТА). Карэспандэнт газеты «Ньюс Кронікл» паведамляе, што 17 красавіка 50 японскіх самалётаў бамбардыравалі густа заселеную паўночную частку г. Кантона (на поўдні Кітая). Забіта больш [illegible] жыхароў. Разбурана 5 школ.

Выбухам бомбы моцна пашкоджан чыгуначны мост, які злучае Кантон [illegible] Ганконгам (англійская калоніяй).

***

ЛОНДАН, 19 красавіка. (БЕЛТА). Шанхайскі карэспандэнт газеты «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост» паведамляе, што кітайскія войскі глыбока ўклініліся ў японскую лінію фронта ў правінцыі Шаньдун. Спроба злучэння паўночнай і паўднёвай калон японскіх войск прадухілена. У раёне Ічжоу пр[illegible] ходзіць канцэнтрацыя сіл абодвух [illegible] коў. Кітайцаў тут каля 250 тысяч, [illegible] японцаў каля 100 тысяч.

Японскія ўлады ўтойваюць факт затрымання ваеннага самалёта на совецкай тэрыторыі

ВЛАДЗІВАСТОК, 19 красавіка. (БЕЛТА). Па атрыманых тут вестках, японская ваеншчына ўтоіла ад японскай грамадскасці факт палёту 11 японскіх ваенных самалётаў над совецкай тэрыторыяй 11 красавіка і затрыманне аднаго з іх совецкімі пагранічнымі ўладамі.

Роўным чынам японскае міністэрства замежных спраў да гэтага часу ўтойвае ад сваёй грамадскасці прапанову совецкага ўрада японскаму ўраду аб узаемным урэгуляванні канкрэтных пратэнзій, выкладзеных у паведамленні ТАСС ад 5 красавіка аб гутарцы наркома Літвінава з японскім пасл[illegible] Сігеміцу.

Аб гэтых нямалаважных фактах японскія газеты не апублікавалі ні адно слова.

ХРОНІКА

У рэзультаце меўшых месца дыпламатычных перагавораў паміж ўрадам СССР і Фінляндыі дасягнута пагадне[illegible] не аб закрыцці ў бліжэйшы час ф[illegible] ляндскага консульства ў Ленінград[illegible]

Намеснік адказнага рэдактара І. М. ОФЕНГЕЙМ

Уп. Галоўлітбела № К—5496. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 49. Ю., Л., Ш.

КОМСАМОЛЬЦЫ-АГІТАТАРЫ

Комсамольская арганізацыя пры калгасе «Металіст», Селішчанскага сельсовета, Гарадоцкага раёна, вылучыла палітычна падрыхтаваных комсамольцаў для правядзення агітацыйна-масавай работы з калгаснікамі.

Вылучаныя тт. Васілеўская, Замхавы, Нікіціна ўжо правялі па некалькі заняткаў па вывучэнню Канстытуцыі БССР, выбарчага закона і аб міжнародным становішчы.

М. ЕУДАКІМАЎ.

ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ПРАПАГАНДЫСТАЎ

Праўленне калгаса «Пролетарый», Хойніцкага раёна, закупіла для сваіх агітатараў-прапагандыстаў вялікую колькасць літаратуры аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР. Зараз кожны агітатар мае да 15 кніг і брашур, у якіх можна знайсці вычарпальны адказ на ўсе пытанні, звязаныя з растлумачэннем Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР».

Я. ЧЭРКАС.

ЗАНЯТКІ З НЕПІСЬМЕННЫМІ І МАЛАПІСЬМЕННЫМІ ВЫБАРШЧЫКАМІ

У калгасе «Чырвоны гігант», Гоцкага сельсовета, Глускага раёна, шырока разгорнута агітацыйна-прапагандысцкая работа з непісьменнымі і малапісьменнымі выбаршчыкамі. З імі асобна праводзяцца заняткі па вывучэнню Канстытуцыі і «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР».

Настаўнік-прапагандыст тав. Званковіч падрабязна спыняецца на кожным артыкуле, каб ні адно слова не асталося незразумелым для слухачоў.

В. ЮХНІК. М. ХАЛАДОК.